

ДУША БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

4

ЯК АФОРМІЦЬ ДАКУМЕНТЫ ДОМА

6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЛЮТАГА 2021 г. СЕРАДА № 30 (29399)

З першых вуснаў

## «ІДЭІ РАЗАРВАЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА НА КАВАЛКІ І ЗАТЫМ РАЗДАЦЬ ПА БАНКАХ Я РАСЦЭНЬВАЮ ЯК АНТЫДЗЯРЖАЎНЫЯ»



Фота БелТА.

### Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе па пытаннях развіцця айчыннай мотавелатэхнікі

**На сустрэчы абмеркавалі праблемы адной з самых старых падгалін нашай прамысловасці. Вытворчасць першай айчыннай мота- і велапрадукцыі пачалася ў 1945 годзе і перажыла, па словах кіраўніка краіны, распад Савецкага Саюза.**

Як акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка, у апошнія гады ва ўсім свеце сфарміраваўся вялізны запыт на здаровы спосаб жыцця, а спартыўная актыўнасць стала папулярнай як ніколі.

СТАР. 2

## ПЭНДЗАЛЬ УВАСКРАШАЕ ГІСТОРЫЮ



Вядомы мастак-рэстаўратар па старажытных палотнах, скульптуры і інтэр'ерах, спецыяліст венецыянскай школы рэстаўрацыі Сяргей ДЗЕНІСЕНКА гэтымі днямі заканчвае сваю чарговую архіважную для айчыннай культуры працу — упрыгожванне другога паверха вежы Гальшанскага замка. У гэтым памяшканні будзе размяшчацца княжацкі пакой будучага замкавага музея. Калісьці рукамі і пэндзлем Сяргея былі адрэстаўраваныя значныя гістарычныя аб'екты — інтэр'еры палаца ў Нясвіжы і Ефрасіннеўскай царквы ў Полацку, Петрапаўлаўскага сабора ў Магілёве і іншых славутых помнікаў дойлідства. А на згаданым аб'екце на ўскраіне Гальшан рэстаўратар ужо аднавіў ляпныя ўзоры і геральдычныя знакі, а цяпер завяршае іх афарбоўку. За гэтым заняткам я і сфатаграфаваў незвычайнага майстра.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## БЯСПЕЧНЫЯ «ШАШАЧКІ»

### Што трэба ведаць пасажыру таксі

**Апошнім часам, асабліва ў перыяд пандэміі, паслугамі таксі беларусы сталі карыстацца нашмат часцей. Разам з тым з'явілася нямала пытанняў — як у пасажыраў да кіроўцаў падчас паездкі, так і ў апошніх часам ёсць прэтэнзіі да сваіх кліентаў. Хто мае рацыю, а хто не? Разабрацца з гэтым дапамаглі спецыялісты Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый. Разам з імі мы адправіліся ў рэйд, каб на свае вочы ўбачыць, ці выконваюць сталічныя таксісты Правілы дарожнага руху, ці маюць патрэбныя для перавозак пасажыраў дакументы і што павінны ведаць тыя, хто садзіцца ў салон.**

СТАР. 5

Шчаслівай паездкі!




Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

КОРАТКА

- **Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота ўзнагароджаны ордэнам Пашаны.**
- У Віцебскай вобласці рэалізуюць пілотны праект па дыягностыцы меланомы з дапамогай мабільнай праграмы.
- **«Спадарожнік V» і «Эпіваккарона» прызнаныя эфектыўнымі супраць брытанскага штама каранавіруса.**
- У Беларусі аб'яўлены конкурс на найлепшы дызайн святлоадбівальнага адзення і аксесуараў.
- **У Нацыянальным аэрапорце Мінск пачалі тэсціраванне на COVID-19 метадам ПЛР.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Моцныя рэгіёны — гэта не толькі новыя рабочыя месцы, прадпрыемствы і жыллё, але і стварэнне ўмоў для творчага і інтэлектуальнага развіцця, вольнага часу, забеспячэнне стандартаў у адукацыі, роўных магчымасцяў для паступлення ў ВНУ. Станоўчы вопыт — добра абсталяваныя класы, скіраваныя на прафесійную арыентацыю і падрыхтоўку школьнікаў. Гэтаму кірунку, як і развіццю мэтавай падрыхтоўкі, неабходна аддаваць павышаную ўвагу. Робіцца гэта для таго, каб малады чалавек, напрыклад, адвучыўшыся ў аграрным класе, пасля заканчэння ВНУ зноў вяртаўся на работу ў родны рэгіён. Прадпрыемствы раёна павінны бачыць у гэтым школьніку свайго будучага спецыяліста, а значыць і ўдзельнічаць у яго падрыхтоўцы, прафесійным станаўленні».*

ISSN 1990 — 763X

21030

# «ІДЭІ РАЗАРВАЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА НА КАВАЛКІ І ЗАТЫМ РАЗДАЦЬ ПА БАНКАХ Я РАСЦЭНЬВАЮ ЯК АНТЫДЗЯРЖАЎНЫЯ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

«Ці тое яшчэ будзе... ***Сусветны рынак велатэхнікі расце хуткімі тэмпамі, нягледзячы на пандэмію, прагнозы сведчаць аб яго штогадовым павелічэнні аж на 9 працэнтаў.*** Таму склаліся найлепшыя ўмовы для развіцця вытворчасці ў гэтай сферы. Дзякуючы таму, што мы неяк працавалі, на мотавелазаводзе захавана вытворчасць вела- і мотапрадукцыі айчынных гандлёвых марак «Aist» і «Мінск», асвоена больш за сотню новых мадэляў ровараў і дзясяткі мадэляў мотатэхнікі», — сказаў Прэзідэнт.

Але, адзначыў ён, фінансава-эканамічныя паказчыкі пакуль не радуюць — доля беларускіх ровараў на ўнутраным рынку зніжаецца з году ў год і складае сёння толькі пятую частку. Слабы экспарт праблему таксама не вырашае.

«І гэта нядзіўна, калі страчана ключавое звяно вытворчасці — уласнае канструктарскае бюро, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Для таго ***каб арганізаваць зборку, вялікага розуму не трэба, але гэта амаль тупіковы шлях.*** Праблемы прадпрыемства, займаючыся зборкай, не вырашыш. Асабліва фінансава-эканамічныя. Ды і праблемы пазыковыя не ўдаецца вырашыць. Механізм работы, якім сёння карыстаецца наш завод, часовы. Працаваць доўга такім чынам немагчыма».

Прэзідэнт пералічыў пытанні, на якія неабходна знайсці на нарадзе адказы. Па-першае, якой бачыцца стратэгія развіцця прадпрыемства?

«Асновы нашай эканамічнай палітыкі толькі што зацверджаны на Усебеларускім народным сходзе. Калі хтосьці думае, што мы зараз прададзім камусьці гэта прадпрыемства (прыватызуем і потым закрыем яго, ці будзем ствараць тут адны спіцы для ровараў, а ўсе кампетэнцыі інвестар перанясе ў Італію, Расію ці Кітай), на гэта нават не разлічвайце. Я хачу, каб вы разумелі, калі я кажу пра МАЗ, БелАЗ, МТЗ, «Гомсельмаш», я кажу, што гэта твар нашай краіны, краіны машынабудаўнічай, гэта брэнды нашай краіны», — дадаў беларускі лідар.

Па яго словах, у гэтым шэрагу і мотавелазавод, які нельга страціць. Прэзідэнт звярнуўся да рашэнняў, прынятых на Усебеларускім народным сходзе, — дамовіліся развіваць тыя кірункі, дзе краіна мае кампетэнцыі і супрацоўнікаў, што ствараюць годную прадукцыю.

«Я хацеў бы ўбачыць комплексны і пралічаны бізнес-план, які арыентаваны строга на запыты спажыўцоў. ***Прадукцыя павінна быць высокай якасці, канкурэнтаздольная»,*** — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што прапанова будаваць новае прадпрыемства за бюджэтныя грошы ў цэнтры Мінска не вытрымлівае крытыкі. Ён прапанаваў выпрацаваць адназначную эканамічна абгрунтаваную і эфектыўную мадэль развіцця вытворчасці з гарантаваным тэрмінам акупнасці да 5 гадоў — калі такі бізнес-праект будзе, то можна весці размову аб фінансаванні.

Па-другое, Прэзідэнт выслухаў прапановы па варыянтах «расчысткі» даўгоў.

«Ідэі разарваць прадпрыемства на кавалкі і затым раздаць па банках («Белгазпрамбанк», «Альфа-банк» і іншыя) я расцэньваю як антыдзяржаўныя. Гэта знішчэнне прадпрыемства», — канстатаваў Прэзідэнт.

Трэцяе пытанне, на якое звярнулі ўвагу на сустрэчы, — што будзе з дзеючай вытворчай пляцоўкай? «Гэта ласы кавалак, выдатны ўчастак у цэнтры горада, і яго памеры перавышаюць патрэбы прадпрыемства. Таму гораду разам з урадам трэба падумаць, як выкарыстоўваць пляцоўку так, каб была карысць для дзяржавы і для людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прапановы аб тым, каб пабудаваць там жыллё і працягнуць павялічваць колькасць насельніцтва сталіцы таксама, па словах кіраўніка краіны, недарэчныя.

«Я чакаю прапаноў праапрацаваных. У адваротным выпадку ўзнікае пытанне, навошта мы туды пасылалі аж старшыню Мінгарвыканкама (кіраўнік завода Мікалай Ладуцька быў мэрам Мінска. — **«Зв.»**)? Што зроблена за гэты час? Нічога для таго, каб прыйсці да Прэзідэнта і зноў прапанаваць вынесці пляцоўку ці завод за кальцавую дарогу, гэту пляцоўку забудаваць жыллём, даць грошы пад будаўніцтва, потым пад абаротку... А потым вы яшчэ прыйдзеце і скажаце, што за вас трэба прадаваць гэтыя ровары», — абурыўся Аляксандр Лукашэнка.

Першым з дакладам выступіў Юрый Назараў, намеснік прэм'ер-міністра. Ён расказаў, што ў 2020 годзе на заводзе выпушчана амаль 70 тысяч ровараў і 3000 адзінак мотатэхнікі, асвоены выпуск электраровараў. Колькасць супрацоўнікаў павялічылася да 120 чалавек. Вынікі гаспадарчай дзейнасці за мінулы год станоўчыя.

«Рост выручкі ад рэалізацыі прадукцыі да ўзроўню 2019 года — 135 працэнтаў. Чысты прыбытак павялічыўся ў чатыры разы ў параўнанні з 2019 годам, экспарт тавараў склаў амаль 6,3 мільёна долараў і ўпершыню летась стаў роўны імпарту», — паведаміў намеснік прэм'ера.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

### Прэзідэнт у найбліжэйшыя тыдні наведае мотавелазавод

Пра гэта па выніках нарады паведаміў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Юрый НАЗАРАЎ.** На месцы кіраўнік краіны прыме канчатковае рашэнне аб будучых шляхах развіцця прадпрыемства. Як акцэнтаваў віцэ-прэм'ер, Аляксандр Лукашэнка даручыў па працягу аднаго-двух тыдняў падрыхтаваць візіт на завод.

«Прадпрыемства будзе развівацца. Яно сёння захавалася, мае пэўныя кампетэнцыі», — сказаў намеснік прэм'ера.

Пляцоўка завода абцяжарана пазыкамі, знаходзіцца пад кіраўніцтвам антыкрызіснага кіраўніка. На нарадзе вырашана, як разабрацца з юрыдычнымі тонкасцямі ўзаемаадносін з крэдыторамі.

Уласнае канструктарскае бюро заводу кампенсуюць два спецыялісты, якія працуюць на аўтсорсінгу, ды і прадпрыемства НАН «Аптрон» распрацоўвае новыя базавыя мадэлі для электратранспарту.

«Адсутнасць уласнага канструктарскага бюро сёння не ўплывае на перспектывы развіцця прадпрыемства», — лічыць Юрый Назараў.

Па яго словах, цікавасць для экспарту вела- і мотатэхнікі ўяўляе еўрапейскі рынак, ёмістасць якога штогод складае 30 мільёнаў адзінак.

«З якім прадуктам можна прыйсці на гэты рынак? Відавочна, што з самым танным туды прыходзіць не варта. Таму што танная прадукцыя асацыюецца з няякаснай. Неабходна прыйсці з якасным. Прэзідэнту далажылі, што на існуючых пляцоўках і пры гэтых тэхналогіях стварыць сучасны прадукт ужо немагчыма, — заявіў намеснік прэм'ера. — Мы прапанавалі стварэнне новай тэхналагічнай вытворчасці з іншымі падыходамі, іншых маштабаў, каб выйсці на еўрапейскі рынак».

Віцэ-прэм'ер дадаў: баяцца, што нас не пусцяць на еўрапейскі («самы маржынальны, які хутка расце, размешчаны побач») рынак не варта, — многія вытворцы ў Беларусі маюць адпаведныя сертыфікаты. Юрый Назараў паведаміў, што магчымым інвестарам новай вытворчасці разглядаецца інавацыйны фонд Мінгарвыканкама.

Плошчы мотавелазавода, якія не запатрабаваныя, мяркуюць аддаць Мінскаму гарадскому тэхнапарку. У рамках тэхнапарка, як паведаміў віцэ-прэм'ер, неабходна разгарнуць вытворчасць камплектуючых для велатранспарту.

«Трэба казаць, што мы не проста на гэтых пляцоўках прырасцём у аб'ёмах вытворчасці ці дададзім 100 рабочых месцаў. Трэба казаць аб стварэнні прынцыпова новай тэхналагічнай вытворчасці з максімальнай лакалізацыяй», — рэзюмаваў Юрый Назараў.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Упершыню ў гісторыі гендырэктарам СГА стала жанчына



Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА) абрала новага генеральнага дырэктара — ім стала прадстаўніца Нігерыі Нгозі Аконджа-Івеала. Яна стала першай жанчынай на гэтай пасадзе. Першапачаткова на пасаду падалі заяўкі прадстаўнікі васьмі краін — Вялікабрытаніі, Егіпта, Кеніі, Карэі, Мексікі, Малдавіі, Нігерыі і Саудаўскай Аравіі, затым прэтэндэнтаў засталося пяцёра, потым іх колькасць знізілася да двух. У канцы кастрычніка Аконджа-Івеала па выніках галасавання групы пастаянных прадстаўнікоў пры СГА апярэдзіла другога прэтэндэнта на пасаду кіраўніка СГА — прадстаўніцу Карэі Ю Мён Хі, але ЗША тады рэзка выступілі супраць яе кандыдатуры (па сутнасці, наклаўшы вета). Паколькі неабходны кансэнсус пры прызначэнні, то з таго моманту ішлі кансультацыі паміж краінамі, якія далі вынік толькі пасля ўступлення на пасаду новага прэзідэнта ЗША.

### Расійская Дзярждума прыняла законапраект аб спыненні незаконнай агітацыі ў інтэрнэце



Дэпутаты Дзярждумы прынялі ў другім чытанні законапраект, згодна з якім Цэнтрвыбаркам Расіі, а таксама рэгіянальныя і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі змогуць звяртацца ў Раскамнагляд з прадстаўленнем аб спыненні распаўсюджвання ў інтэрнэце агітацыйных матэрыялаў, якія парушаюць закон, паведаміла ТАСС. Дакумент у лістападзе мінулага года ўнеслі ў ніжнюю палату парламента дэпутаты ад «Адзінай Расіі». Аўтары законапраекта прапаноўваюць надзяліць ЦВК Расіі і выбарчыя камісіі суб'ектаў РФ паўнамоцтвамі па звароце ў Раскамнагляд «з прадстаўленнем пра спыненне распаўсюджвання ў інтэрнэце агітацыйных матэрыялаў, якія выраблены і (або) распаўсюджваюцца з парушэннем патрабаванняў заканадаўства РФ аб выбарах і рэферэндумах, пры правядзенні адпаведных выбараў». Парадак такіх зваротаў вызначыць ЦВК. Новаўвядзенне прапануецца распаўсюдзіць у тым ліку і на закон аб выбарах дэпутатаў Дзярждумы.

### Халады ў Еўропе: замерзлае Балтыйскае мора і сібірскія маразы ў Грэцыі



Сведкамі рэдкага відовішча сталі турысты і жыхары польскага курортнага горада Мендзыздрае. З-за моцных халадоў Балтыйскае мора каля яго ўзбярэжжа замерзла ўпершыню за чвэрць стагоддзя, паведаміла Euronews. Берагавая лінія з пясчаным пляжам і воднымі далягладамі ператварылася ў арктычны пейзаж са снегу і лёду. Зімовыя пейзажы ў лютым упрыгожылі і Стамбул. Знакамітыя Сабор Святой Сафіі і Блакітная мячэць стаяць у незвычайным снежным уборы. Метэаролагі прагназуюць, што халады пратрымаюцца як мінімум да 18 лютага. Сібірскія маразы «ўдарылі» і па Грэцыі. Улады звярнуліся да грамадзян з заклікам абмяжаваць перамяшчэнні па вуліцы. Галоўную магістраль краіны, якая звязвае Афіны з паўночнымі раёнамі, прыйшлося закрыць з-за снегападу.

## Фінансы

### Замежнікі нам даверылі амаль 9 млрд долараў інвестыцыямі

**Як паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт Беларусі, за мінулы год у рэальны сектар эканомікі (акрамя банкаў) замежныя інвестары ўклалі 8,7 млрд долараў інвестыцый.**

Асноўнымі замежнымі ўкладчыкамі арганізацый нашай краіны былі суб'екты гаспадарання Расійскай Федэрацыі (41,4 % ад усіх інвестыцый), Кіпра (9,4 %), Аўстрыі (7,4 %), Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі (6,8 %).

Прамыя замежныя інвестыцыі склалі 6 млрд долараў, ці 69,2 % ад усіх замежных інвестыцый, якія паступілі.

Як вынікае са справаздачы Белстата, нашы юрыдычныя асобы ўкладвалі грошы ў развіццё свайго бізнесу за мяжой у значна меншых аб'ёмах. За 2020 год арганізацыямі краіны (акрамя банкаў) накіравана за мяжу інвестыцый на суму 4,9 млрд долараў.

Значныя аб'ёмы інвестыцый арганізацыямі былі накіраваны суб'ектам гаспадарання Расійскай Федэрацыі (66 % ад усіх накіраваных інвестыцый), Украіны (9 %), Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі (8 %), Ірландыі (6,1 %). На долю прамых інвестыцый прыходзілася 88,7 % усіх інвестыцый, накіраваных за мяжу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Занятасць

# Патрабуюцца кіроўца, медсястра, ляснік...

## Падведзены вынікі па сітуацыі на рынку працы за 2020 год

**Колькасць беспрацоўных, якія знаходзяцца на ўліку ў органах па працы, у студзені 2021 года на 18 працэнтаў меншая, чым у той жа перыяд у 2020 годзе, і складае 7,2 тыс. чалавек, паведамляе БелТА са спасылкай на Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

У органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па садзейнічанне ў працаўладкаванні летась звярнуліся 152,7 тыс. чалавек (85,6 працэнта да 2019 года), з іх 70,7 тыс. чалавек зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных (76,7 працэнта да 2019 года). Працаўладкаваны 117,6 тыс. чалавек, у тым ліку 50,6 тыс. беспрацоўных. На прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі, навучальныя курсы накіравалі 4,4 тыс. чалавек, на аплатныя грамадскія работы — 33,5 тыс. Яшчэ 1629 грамадзян атрымалі садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці.

Сярэднестатыстычны партрэт беспрацоўнага (афіцыйна) беларуса — мужчына 35—49 гадоў. Але таксама даволі шмат мужчын ва ўзросце 55—57 гадоў знаходзяцца ў пошуку работы. З агульнай колькасці беспрацоўных моладзь ва ўзросце 16—30 гадоў займае толькі 18,7 працэнта, жанчыны — 37,3 працэнта.

Пры гэтым на працягу года назіраліся хвалі росту і зміншэння колькасці зарэгістраваных беспрацоўных. Рэзкі спад рэгістрацыі адбыўся ў красавіку 2020-га, паступова гэты паказчык дасягнуў 6,2 тыс. новых беспрацоўных у кастрычніку, а да канца года знізіўся да 4 тыс. Перыяд беспрацоўя ў сярэднім дасягае 2,9 месяца.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на 1 студзеня 2021 года склаў 0,2 працэнта да колькасці рабочай сілы (як і год таму). Найгоршая сітуацыя ў двух раёнах Віцебскай вобласці — Пастаўскім і Полацкім (больш за 0,5 працэнта).

Як паведамлялася, на 2020 год быў вызначаны пералік тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы, у які ўвайшлі 29 рэгіёнаў, а ў 2019-м было 53. Па Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай абласцях у пералік уключана па 3 раёны, Гродзенскай — 2. Больш за ўсё такіх тэрыторый у Віцебскай і Мінскай абласцях — па 9 раёнаў.

Каэфіцыент напружанасці на рынку працы (колькасць беспрацоўных на адну вакансію) праз год застаўся нязменны — 0,1. На пачатак гэтага года наймальнікі прапанавалі 72 тыс. вакансій, або 86,1 працэнта да таго, што было ў агульнарэспубліканскім банку на год раней. Патрэба ў работніках па рабочых прафесіях склала 61,5 працэнта ад агульнай колькасці вакансій.

У топ-10 запатрабаваных сярод наймальнікаў работнікаў трапілі кіроўца аўтамабіля, прадавец, прыбіральшчык памяшканняў, швачка, повар, санітарка, кантралёр-касір, грузчык, муляр, электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання. Сярод спецыялістаў і служачых — медсястра, урач-спецыяліст, інжынер, фельчар-лабарант, ветурач, ляснік і іншыя. Пры гэтым у сельскай мясцовасці наймальнікі часцей шукаюць трактарыстаў-машыністаў, аператараў машыннага даення, жывёлаводаў і заатэхнікаў.

Грошы

# Біржа BYNEX — першы легальны сэрвіс па абмене крыптавалют у нашай краіне

**Беларусбанк выступіў стратэгічным партнёрам кампаніі «ЕРПБЕЛ» (ERPBEL), якая распрацавала платформу для крыптавалютной біржы BYNEX. Дзякуючы супрацоўніцтву гульцы біржы могуць уводзіць і выводзіць фіятную валюту (беларускія рублі і долары ЗША) з самай нізкай камісіяй, выкарыстоўваючы плацежную картку VISA.**

Нагадаем, што BYNEX — гэта новая крыптабіржа, якая дазваляе працаваць з Bitcoin і Ethereum, уводзіць і выводзіць сродкі з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак. Біржа пачала работу з пачатку гэтага года і ўжо адкрыта для рэгістрацыі фізічных і юрыдычных асоб.

Адна з пераваг гэтай біржы перад іншымі крыптабіржамі — гэта наяўнасць беларускай валюты, што дазваляе любому рэзідэнту Беларусі легальна інвеставаць у крыптавалюту, абыходзячы неабходнасць канверсіі валют. Таксама платформа забяспечвае кантроль за выкананнем стандартаў па абароне персанальных даных удзельнікаў крыптабіржы і адпаведнасць працэсаў нормам нацыянальнага, міжнароднага заканадаўства і прававога рэжыму ПВТ.

Аператарам крыптаплатформы BYNEX з'яўляецца ТАА «ЕРПБЕЛ» — рэзідэнт Парка высокіх тэхналогій (ПВТ), які аказвае поўны комплекс паслуг па распрацоўцы праграмнага забеспячэння з 2007 года. Кампанія мае ліцэнзію на ажыццяўленне дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь па тэхнічнай абароне інфармацыі, у тым ліку крыптаграфічнымі метадамі.

Стратэгічнае партнёрства ў рэалізацыі сэрвісаў па абмене крыптавалют — частка праграмы па лічбавай трансфармацыі Беларусбанка, заявілі ў прэс-службе гэтага найбуйнейшага банка краіны. Нагадаем, што ўвосень 2018 года Беларусбанк стаў партнёрам кампаніі WhiteBird, якая аказвае паслугі па абмене крыптавалют у прававым полі Дэкрэта № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі», а ў лістападзе 2020 года кампаніі сумесна запусцілі першы легальны сэрвіс па абмене крыптавалют.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Цікавы досвед

# МУЗЕЙ ЗБІРАЕ ГІСТОРЫЮ... У ЛЮДЗЕЙ

**Адзенне, посуд, кнігі, фотаздымкі, прадметы побыту... Усё, што здаецца нямодным ці непатрэбным, можа стаць рарытэтам ці гісторыяй. Краязнаўчыя музеі Карэліцкага і Ашмянскага раёнаў Гродзенскай вобласці прапануюць мясцовым жыхарам зрабіць падарунак сваім старым рэчам і ператварыць іх у музейныя экспанаты.**

Часта тое, што засталося ў спадчыну ад прашчураў, становіцца непатрэбным новым гаспадарам і, на жаль, адпраўляецца на сметніцу ці ў печ. Аднак сярод куч непатрэбнага могуць знайсціся сапраўдныя скарбы, цана якім — памяць.

Дзякуючы вам, нашчадкі змогуць атрымаць унікальную інфармацыю і пабачыць рарытэтныя рэчы, якія раскажуць пра маладосць бацькоў, бабуль, дзядуляў і прадзедаў, пра гісторыю краю, пра тое, як працавалі і адпачывалі нашы продкі, заклікаюць супрацоўнікі музеяў.

Тут будуць удзячны самым розным рэчам. Савецкім цацкам, прадметам школьнай тэматыкі, манетам, музычным інструментам, рэчам яўрэйскага паходжання, савецкай, піянерскай і камсамольскай атрыбутыцы... усё гэта можа стаць экспанатам.

Карэліцкі раённы краязнаўчы музей назваў акцыю «Я дару музею». Тут абяцаюць, што рэчы атрымаюць другое жыццё, і іх былыя ўладальнікі пабачаць іх на выставках і экспазіцыях, а самых актыўных дарыльшчыкаў у лістападзе чакаюць падзякі і віншаванні на новай выстаўцы з новых рэчаў, якія назбіраюцца на працягу года.

Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. Багушэвіча аб'явіў «Тыдзень мецэната», падчас якога ўсе ахвотныя маюць магчымасць прынесці старыя рэчы, што змогуць стаць наглядным сведчаннем будучым пакаленням пра гістарычнае мінулае простых беларусаў. Падарункі для «мецэната» таксама плануюцца.

Так што для тых, хто даўно збіраўся ператрэсці бабуліны скрыні ці разгрэбці хлам на гарышчы, самы час заняцца пошукам старадаўніх рэчаў і праз іх унесці самога сябе ў гістарычны летапіс.

**Ірына СІДАРОК.**

Класныя навіны

# АЎТАРСКІ ПАДЫХОД ДА ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ

## Стартаваў рэспубліканскі конкурс «Дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі ў аб'ектыве»



**Да ўдзелу ў ім запрашаюцца педагагічныя работнікі ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама іншых устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі індывідуальна або ў складзе творчых калектываў, але не больш за два аўтары ў адной конкурснай рабоце.**

Арганізатарам конкурсу выступае Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства. Яго мэта — выяўленне і падтрымка творчага патэнцыялу педагогаў у рэалізацыі экалагічнай адукацыі, папулярызацыя інавацыйных практык, абагульненне і распаўсюджванне перадавога вопыту.

Конкурс праводзіцца ў дыстанцыйнай форме ў некалькі этапаў. З 1 лютага да 11 кастрычніка 2021 года будзе адбывацца прыём заявак і конкурсных матэрыялаў з улікам абранай намінацыі на адрас электроннай пошты Рэспубліканскага цэнтра eco.unibel@mail.ru.

Для ўдзелу ў конкурсе падаюцца актуальныя аўтарскія матэрыялы, у тым ліку з выкарыстаннем медыяадукацыйных тэхналогій і прымяненнем інтэрактыўных сродкаў навучання і выхавання. Конкурсныя работы павінны адпавядаць заяўленай тэме, быць змястоўнымі і арыгінальнымі, адпавядаць стандартам афармлення. Пры адборы матэрыялаў пад увагу бяруцца актуальнасць і адпаведнасць матэрыялаў сучасным тэндэнцыям развіцця адукацыі, дакладнасць прыведзенай інфармацыі, творчы падыход да раскрыцця тэмы, змястоўнае, выразнае і арыгінальнае аўтарскае рашэнне, магчымасць тыражавання інавацыйных практык і прапанаванага вопыту.

Пераможцы і прызёры конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступеняў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і граматамі Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Будзь у курсе!

# Дадатковыя цягнікі на сакавіцкія святы

**З улікам павышанага попыту пасажыраў на перавозкі з 5 да 8 сакавіка Беларуская чыгунка прызначыла 13 дадатковых цягнікоў у міжрэгіянальных і рэгіянальных зносінах, якія будуць курсіраваць па найбольш запатрабаваных у пасажыраў маршрутах: Мінск — Гомель, Мінск — Віцебск, Мінск — Гродна, Полацк — Мінск, Гомель — Магілёў, Мінск — Светлагорск, Орша — Крычаў. З улікам прагназуемага павелічэння пасажырапатоку найбольшая колькасць цягнікоў прадугледжана на 8 сакавіка.**



Фота БелТА.

Таксама ў сувязі з гэтым скарэкціраваны графік руху асобных цягнікоў. Так, саставы № 682/681 Брэст — Мінск, № 667/646 Мінск — Брэст, № 678 Камунары — Орша, № 683 Гомель —Мінск, № 747 Гомель — Мінск, № 697/698 Гомель — Віцебск, № 676/675 Брэст — Гомель і № 859/860 Мінск — Пінск прызначаныя ў зварот на 8 сакавіка замест 7 сакавіка. Цягнікі № 684 Мінск — Гомель і № 697/698 Віцебск — Гомель будуць курсіраваць па Беларускай чыгунцы 9 сакавіка замест 8 сакавіка.

У прэс-цэнтры БЧ нагадалі, што продаж праязных дакументаў на цягнікі міжрэгіянальных ліній ажыццяўляецца за 45 сутак, а на цягнікі рэгіянальных ліній бізнес-класа за 20 сутак да адпраўлення цягніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




# Стаўка на інтэлект і ахова мацярынства

## Дэлегаты УНС абмяняліся думкамі па актуальных пытаннях са студэнтамі Гродзенскага ўніверсітэта імя Я. Купалы

**Сустрэча прайшла ў фармаце дыялогавай пляцоўкі. За круглым сталом былі выказаны меркаванні дэлегатаў Усебеларускага сходу, а таксама студэнтаў, якія прыйшлі на сустрэчу. Размова датычылася як будучага краіны, так і развіцця самай буйной на Гродзеншчыне вышэйшай навучальнай установы. Моладзь цікавілі пытанні падтрымкі сям'і, інтэлектуальны кірунак, а таксама прыярытэты рэгіянальнага руху.**


Фота grodnonews.by.

Што наконт самога ўніверсітэта, то тут будзе працягнуты курс на ўкараненне інавацый, лічбавізацыю навучання, падкрэсліла дэлегат сходу, **рэктар ГрДУ Ірына КІТУРКА.** Такая работа тут актыўна вядзецца. Пры ВНУ два гады таму створаны навукова-тэхналагічны парк для рэалізацыі інавацыйных праектаў. Цяпер ён месціцца ў аднаўленым будынку і налічвае 13 рэзідэнтаў, з якіх палова — студэнты і выкладчыкі ГрДУ імя Янкі Купалы. А тэхнапарк стварае пэўную інфраструктуру для развіцця інавацыйнага прадпрымальніцтва. Праекты скіраваны як на раскрыццё ўнутранага патэнцыялу адукацыйнай установы, так і на дапамогу студэнтам на рынку працы. Менавіта так можна выпрацаваць асабістую арыентаванасць у моладзі, лічыць Ірына Кітурка. А гэта якраз той патэнцыял, які ў значнай ступені будзе садзейнічаць выкананню Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця.

— Нам важна, як універсітэт будзе ўпісвацца ў гэтую Праграму, — адзначыла Ірына Кітурка. — Стратэгія апераджальнага развіцця, на якую мы ўзялі курс, сведчыць, што мы рухаемся ў правільным кірунку. Мы ўдзельнічаем у эксперыментальным праекце па ўкараненні канцэпцыі «Універсітэт 3.0» і скіраваны на ўніверсітэт прадпрымальніцкага тыпу. Гэта і ёсць той стымул, які дазваляе прадбачыць перспектыву і быць на крок наперадзе.

Але асобасная скіраванасць — яшчэ паўсправы. Сучаснасць патрабуе высокаінтэлектуальнага спецыяліста. Таму ўстанова будзе выкарыстоўваць розныя фарматы, у тым ліку і дыялогавыя пляцоўкі, каб студэнты маглі атрымліваць неабходную інфармацыю, аналізаваць яе і рабіць высновы. Гэта таксама адзін з інструментаў пабудовы інтэлектуальнай краіны, аб якой гаворыцца ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця, упэўнена рэктар універсітэта.

У сустрэчы ўзяла ўдзел адна з самых маладых дэлегатаў сходу, **магістрантка ГрДУ Бажэна ЯРЭМІЧ.** За апошні час яна стала адной з вядомых медыйных асоб. І трэба сказаць, даволі заслужана. Яе «партфоліа» сапраўды ўражвае. Яна — удзельніца розных конкурсаў, у тым ліку «Студэнт года», аўтар больш чым 15 навуковых артыкулаў, прызёр рэспубліканскай юрыдычнай алімпіяды, занесена ў Банк даных адоранай і таленавітай моладзі Беларусі, двойчы трапляла на Дошку гонару ГрДУ, была сярод запрошаных на мерапрыемствы з удзелам Прэзідэнта краіны. Падчас сустрэчы Бажэна адзначыла, што Беларусь — краіна роўных магчымасцяў. У якасці прыкладу прывяла сябе. Як яна, дзяўчына са звычайнай сям'і, усяго дасягала сваім розумам і працай. Пры гэтым для раскрыцця патэнцыялу асобы ёсць усе магчымасці.

Бажэну хвалююць многія аспекты жыцця, у першую чаргу тыя, што датычаць моладзі.

— На Усебеларускім сходзе я звяртала ўвагу на ініцыятывы, якія прапануе моладзь. Цікавых, яркіх ідэй было нямала, і вельмі прыемна, што многія з іх сапраўды знаходзяць разуменне ў грамадстве, — заўважыла Бажэна Ярэміч. — Адной з такіх актуальных тэм лічу тэму падтрымкі мацярынства. І на сходзе прагучалі прапановы, якія дапамогуць палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў краіне, павысіць нараджальнасць і дадуць дадатковыя гарантыі маці. Бо выхаванне дзяцей — вельмі адказная справа і не меньш важная, чым, напрыклад, работа на прадпрыемстве.

На думку маладога дэлегата, работу па выхаванні дзяцей варта ацаніць адпаведна і ўключыць у працоўны стаж. Гэта дасць дадатковы стымул для ўмацавання сям'і і паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# «Я ДУМАЮ ПА-БЕЛАРУСКУ, МОВА — МАЯ ДУША...»

## Прызнаецца малады настаўнік з вясковай школы, дэлегат УНС Антон Лабаноўскі

**Прычым не дзесьці ў вузкай кампаніі або школе, дзе ён выкладае беларускую мову і літаратуру. Ён гэта зрабіў і з трыбуны шостага Усебеларускага народнага сходу, на якім прысутнічаў як дэлегат ад Магілёўскай вобласці. Словы 28-гадовага настаўніка не нейкі там піяр. Гэта яго шчырае стаўленне да роднага слова. Ён меў усе магчымасці застацца выкладаць свой прадмет у гарадской школе, але паехаў у аграгарадок Мяжысеткі. Яго прадмет, напэўна, адзін з самых любімых у вучняў. Яны ідуць на заняткі і ведаюць, што з іх настаўнікам сумна дакладна не будзе.**

### Спачатку было слова

Антон Лабаноўскі прыйшоў у сваю прафесію па прызванні. Яго маці і бабуля таксама настаўнікі і былі толькі за, каб Антон працягнуў дынастыю. А вось за выбар прадмета ён удзячны сваёй настаўніцы Алене Селязнёвай, якая прывіла яму любоў да роднай мовы.

— Я думаю па-беларуску, гэта мова маіх продкаў, мая душа, я не маю права не ведаць яе, — кажа ён і спрабуе прывучыць да гэтага сваіх вучняў.

Дарэчы, вясковую школу Антон выбраў асэнсавана. «Я сам вучыўся ў вёсцы і добра ведаю псіхалогію яе жыхароў», — прыводзіць ён неаспрэчны аргумент. Маўляў, і людзі тут працейшыя, і шчырасці больш, а сельскія дзеці лягчэй уключаюцца ў навучальны працэс. Ды і класы на вёсцы меншыя, чым у горадзе, працэй дайсці да кожнага, удзяліць больш увагі. Ён супраць сумнага чытання прадмета і нейкіх там звышвысокіх патрабаванняў. Наадварот, лічыць, што крык і адсутнасць павагі да вучня, могуць цалкам адбіць у яго цікавасць да вучобы. А настаўніку вельмі важна, каб адбыўся кантакт. «Мне заўсёды хочацца хутчэй з вучнем дамовіцца, чым злавацца на яго, — прызнаецца ён. — Ёсць такая думка, што, калі чалавеку кажаш штосьці шэптам, ён цябе слухае больш уважліва. Не я гэта прыдумаў, я толькі ўзяў гэта сабе на ўзбраенне». У рабоце настаўнік выкарыстоўвае малюнкі, каб вучням было лягчэй разабрацца з тэмай. І ніколі не глядзіць на падлетка з вышыні сваіх ведаў, наадварот, імкнецца размаўляць на яго мове. Толькі так можна спадзявацца на нейкі вынік. Шкада толькі, што для больш дасканалага вывучэння мовы не хапае часу. Бо 45 хвілін для замацавання адразу некалькіх тэм занадта мала.

— Для дзяцей, якія чуюць часцей рускую мову, гэта важна, — адзначае настаўнік. — Асабіста я часта карыстаюся беларускай і ў звычайным жыцці. І майму сыну, а бацькам я стаў у 21 год, яшчэ на пятым курсе ўніверсітэта, лягчэй яе разумець. Але я яму яе не навязваю, я прывіваю любоў праз дыялогі, гульню. Прымусам нічога не дабіцца. Чалавек павінен сам зрабіць свой выбар. Да таго ж я пішу вершы, а апошнім часам пачаў ствараць казкі для сына. Дачка яшчэ маленькая, але яна таксама ўжо прывыкае да роднай мовы.

### З чаго пачынаецца радзіма?

Вядома, што з мовы і таго месца, дзе ты нарадзіўся. Таму Лабаноўскі і аддае так шмат увагі краязнаўчай рабоце.

— Для маіх вучняў радзіма пачынаецца з майго кабінета, там ёсць некалькі экспанатаў культурнай спадчыны тутэйшай мясцовасці, месца, дзе яны нарадзіліся і жывуць, — кажа ён. — Прапаноўваю дзецям складаць свае радаводы, бо знаёмства з гісторыяй роднага краю часцей за ўсё пачынаецца праз сям'ю. Перакананы, што ўсе мае вучні ведаюць паходжанне назвы Мяжысеткі.

Цяпер настаўнік разам з вучнямі збіраецца далучыцца для стварэння інтэрактыўнай карты гісторыі з хэштэгам «Мая зямля — Прыдняпроўе». У справе плануецца задзейнічаць усіх, пачынаючы ад жыхароў, заканчваючы мясцовай уладай. Бо інфармацыі трэба шмат і разнабаковай.

— Гэтая карта будзе ўяўляць сабой дадатак, з дапамогай якога можна выбраць для сябе маршрут экскурсіі або пазнаёміцца з мясцовасцю дыстанцыйна, — удакладняе педагог.



### Трэба шмат ведаць і быць крэатыўным

Калі займаешся любімай справай, у цябе няма ніякіх шанцаў рабіць яе дрэнна. Не дзіўна, што Антон Лабаноўскі імкнецца ў сваёй рабоце да дасканаласці. Сёння магчымасцяў для развіцця неабмежаваная колькасць, толькі не лянуйся, эксперыментуй. Шматлікія адукацыйныя інтэрнэт-сэрвісы, анлайн-стасункі, сайты крэатыўных педагогаў — усё гэта на карысць тым, хто не прывык працаваць сумна. Трымаць сябе ў форме вельмі дапамагаюць конкурсы. І самы прэстыжны — конкурс педагагічнага майстэрства «Настаўнік года», пераможцам якога Антон Лабаноўскі стаў летась на абласным этапе. А вось свайму станаўленню як педагога, суразмоўнік удзячны ў першую чаргу Магілёўскаму абласному інстытуту развіцця адукацыі. Адсюль і гэта яго смеласць, упэўненасць, перакананасць. Ёсць вопыт удзелу і ў міжнародным конкурсе «Пазнанне ў сутворчасці». Калі лёс дае шанц паглядзець, што могуць іншыя і сябе паказаць, чаму не скарыстацца?

Настаўнік, які вядзе актыўнае грамадска-палітычнае жыццё, папулярызуе беларускую мову (не трэба яе лічыць першай або другой, яе проста трэба ведаць), не ўпускае магчымасцяў паспрабаваць сябе на трываласць (прафесійныя конкурсы якраз тое, што ў гэтым дапамагае), не можа не выклікаць цікавасці да сябе. Папулярнасць таксама цяжкае выпрабаванне, перакананы Антон, таму лічыць правільным абстрагавацца, а часам зусім не рэагаваць на знешнія раздражняльнікі. Яго справа не палімезаваць, а вучыць дзяцей. І гэтым ён займаецца з усёй адказнасцю.

### «Не мяняць, а ўдасканальваць...»

Антон Лабаноўскі кажа, што, калі ехаў на Усебеларускі народны сход, хваляваўся. Бо разумеў, што будзе выказваць не толькі асабістыя думкі, а пажаданні сваіх калег, родных, знаёмых. Нешта мяняць у сучаснай сістэме адукацыі няма сэнсу, лічыць ён, а вось удасканальваць неабходна. Напрыклад, тую ж прафарыентацыю. Гэта дрэнна, калі выпускнік школы не ведае, кім бы ён хацеў працаваць.

— Я вось настаўнік, але гэта не значыць, што ўсе мае вучні павінны выбраць гэтую прафесію, — кажа ён. — Трэба стварыць умовы, каб і пра іншыя спецыяльнасці яны ведалі не па расказах. Не лішнім будзе ўвесці ў адукацыйны працэс нешта накшталт экскурсій на прадпрыемствы, прамысловыя аб'екты, у аграгаспадаркі. А яшчэ рабіць пазакласныя мерапрыемствы з удзелам і запрашэннем прадстаўнікоў розных прафесій. Каб вучні не толькі купляліся на нейкую там прывабную абгортку — маўляў, ідзіце да нас, не пашкадуеце, — а бачылі працу знутры, знаёміліся з яе асаблівасцямі, цяжкасцямі, перавагамі. Тады менш будзе расчараванняў у маладых спецыялістаў. Маўляў, мы зусім іншае сабе ўяўлялі.

— У Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступную пяцігодку шмат пасылаў для развіцця, — адзначае Антон Лабаноўскі. — Я бачу, колькі ўжо зроблена і колькі яшчэ трэба зрабіць для таго, каб наша краіна стала яшчэ больш моцнай і прыгожай. І тут шмат чаго залежыць ад кожнага чалавека канкрэтна. Самаадданая работа на месцах паспрыяе нашаму агульнаму развіццю.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва аўтара.**

# БЯСПЕЧНЫЯ «ШАШАЧКІ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наша сумесная работа пачалася а сёмай гадзіне раніцы. Са **спецыялістамі ўпраўлення кантролю аўтатранспарту філіяла Транспартнай інспекцыі па Мінску і Мінскай вобласці Андрэем ЖЛОБІЧАМ**, а таксама **Уладзіславам ШАМЕЦЬКАМ** спыніліся ў раёне чыгуначнага вакзала. Міма едуць дзясяткі аўто, вялікая колькасць з якіх — таксі. Серабрыстая Lada спынілася на паркоўцы, мужчына за рулём — індывідуальны прадпрымальнік, а значыць, сам адказвае за тэхнічны стан транспарту перад выездам у рэйс. Аднак не ўсё аказалася гладка, сярод парушэнняў кіроўцы — адсутнасць знешняга і ўнутранага афармлення салона, праблемы з перыядычнасцю атрымання допуску транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху і адсутнасць страхавога поліса грамадзянскай адказнасці перавозчыка перад пасажырамі.

Андрэй Жлобіч кажа, што ў большасці выпадкаў ва ўсіх таксістаў аднолькавыя. Сярод іх — не пройдзены тэхагляд (часцей за ўсё кіроўцы праходзяць яго раз у два гады, але па заканадаўстве гэта варта рабіць кожныя паўгода), адсутнасць абавязковага страхавога поліса перавозчыка перад пасажырамі і тыя парушэнні, якія згадалі вышэй.

...Пакуль Уладзіслаў Шамецька распавядаў аўтамабілісту пра яго правы і абавязкі як кіроўцы, з'явілася думка: дзіўна, што хтосьці ў прынцыпе займаецца такой сур'ёзнай (а аўтатранспарт — гэта сродак павышанай небяспекі) дзейнасцю, нічога пра яе толкам не ведаючы. Аднак спецыяліст растлумачыў: «Сапраўды бывае, што некаторыя анлайн-сервісы ўводзяць у зман сваіх работнікаў, запэўніваючы, што іх страхуюць, але на самай справе гэта не так. У цэлым сталічныя таксісты сталі выпраўляць парушэнні хутчэй, чым яшчэ некалькі гадоў таму. Але ж зразумела, што некаторыя мэтанакіравана своечасова не праходзяць тэхагляд, не маюць патрэбных дакументаў, лічаць, што так прасцей: не трэба марнаваць і час, і грошы».

Выдача прадпісанняў аб парушэннях — справа, якая патрабуе нямала часу: на тое, каб расказаць аб неабходным, выслухаць, аформіць дакументы. Адпусціўшы аднаго кіроўцу, адразу спынілі наступнага. «Што ён парушыў?» — цікаўлюся ва Уладзіслава Шамецькі. «Здаецца, усё, што было толькі магчыма. Па-першае, адсутнічаюць знешняе і ўнутранае афармленне аўто, страхавы поліс грамадзянскай адказнасці перавозчыка перад пасажырамі, парушана перыядычнасць дазволу допуску да ўдзелу ў дарожным руху, таксама няма пры сабе пасведчання кіроўцы і таксометра (які патрэбны пры перавозцы пасажыраў за гатоўку). Дарэчы, менавіта гэтага таксіста мы ведаем добра, прыкладна раз у месяц трапляецца нам на вочы і атрымлівае акты аб пэўных парушэннях».

Кожнага кіроўцу можна «прабіць» па асобнай базе і высветліць, ці прыцягваўся ён, або дырэктар арганізацыі, ці іншая адказная асоба за выпуск транспартнага сродку на лінію. «Звычайна парушальнікі спакойна рэагуюць на нашы заўвагі, але часам таксіст не валодае дакладнай інфармацыяй, таму пачынае канфліктаваць. Але часцей за ўсё пасля нашага тлумачэння згаджаюцца і супакойваюцца», — адзначыў Уладзіслаў Шамецька.

— А бывае пагоня за аўтамабілямі таксі? — цікаўлюся ў спецыялістаў.

— Вельмі часта. Наш экіпаж не раз ездзіў па горадзе за парушальнікамі, асабліва ў гадзіну пік. У некаторых выпадках такая справа зацягваецца надоўга. А вось п'яныя або бясправныя сярод таксістаў сустракаюцца вельмі рэдка, іх амаль няма, што радуе. Дарэчы, мы можам без усялякіх пазначэнняў апазнаць таксіста на звычайным, здавалася б, аўто. Па марцы машыны, адкрытым на тэлефоне мабільным дадатку, які выкарыстоўвае амаль кожны таксіст. Вось раніцай спынілі такі аўтамабіль. Кіроўца спрабаваў збегчы ад нас, але не выйшла. Увогуле, па назіраннях больш як 90 працэнтаў таксістаў мае хоць адно парушэнне. Бываюць такія, хто нават пасля пяці, шасці прадпісанняў аб парушэннях не выпраўляе сітуацыю — ці то з-за нежадання губляць час і грошы, ці то з-за звычайнай лянoты.

Дарэчы, многіх кіроўцаў таксі мы ўжо добра ведаем у твар, нават дырэктараў іх арганізацый, і радуе, калі пасля выпісанага акта за нейкае парушэнне сустракаеш іх на лініі ўжо ў належным стане. Прыемна глядзець на аўтамабіль: і допуск атрыманы, і курсы кіроўцаў таксі пройдзены, і адпаведна аформленае аўто, — кажа Андрэй Жлобіч.

Спецыялісты расказалі, што часта можна назіраць, як кіроўцы спрабуюць падмануць, каб не атрымаць парушэнне. Маўляў, «вязу не пасажыра, а сябра—жонку—цешчу—брата»...

— Нядаўна злавілі таксіста, які вёз пасажыраў на машыне ў аварыйным стане: біты бампер, няспраўныя фары, лопнутае лабавое шкло... У такіх кіроўцаў адказ заўсёды адзін — прыводзім аўтамабіль у парадак. Пытанне ў такім выпадку ўзнікае і да пасажыраў. Навошта садзіцца ў такую машыну? Але яны кажуць, што так паездка абыходзіцца значна танней. Вось і атрымліваецца, што пытанне грошай стаіць вышэй за ўласную бяспеку, — заўважае Уладзіслаў Шамецька.

Варта адзначыць, што на сёння пасажыры маюць шмат прэтэнзій да тых таксістаў, якія не карыстаюцца паслугамі дыспетчара, а бяруць «ад бардзюра» па таксометры.

— Так, назіраем шмат выпадкаў, калі пасажыр садзіцца ў аўто, а па выніку паездка атрымліваецца ў два-тры разы даражэйшая, чым абгаворвалася першапачаткова... Каб не трапіць у непрыемную сітуацыю, трэба на месцы даведацца, колькі будзе каштаваць паездка, а таксама прастой. Кіроўца абавязкова павінен агучыць прыкладную суму згодна з касавым апаратам, сумешчаным з таксометрам, і, прыбыўшы на месца, выдаць чэк пасажыру. Калі яго няма — вы маеце права не аплачваць паездку згодна з правіламі аўтамабільных перавозак пасажыраў. Калі заказ быў зроблены праз мабільны дадатак са спісаннем сродкаў з вашай банкаўскай карткі, то чэк павінен прыйсці вам па электроннай пошце, — звярнуў увагу Уладзіслаў Шамецька.

На што трэба звярнуць увагу ў таксі, каб засцерагчы сябе як пасажыра перад паездкай? «Перш за ўсё гэта наяўнасць страхавога поліса перавозчыка перад пасажырамі, — так вы цалкам застрахаваныя і ў выпадку ДТЗ атрымаеце грашовую кампенсацыю. Ды і ўвогуле важна спытаць пра ўсе тыя дакументы, якія мы ўжо згадвалі раней, яны аднолькава неабходныя», — падсумаваў Андрэй Жлобіч.

Падчас гутаркі з супрацоўнікамі Транспартнай інспекцыі на стаянку таксі пад'ехаў яшчэ адзін кіроўца на серабрыстым Reno. Спецыяліст настаяў на праверцы дакументаў, таксіст адказаў, што іх у яго няма, маўляў, забыўся. Саставілі адпаведны акт і адпусцілі, спадзеючыся, што ў наступны раз абыдзецца без парушэнняў. А далей спынілі таксіста, які ўсе пытанні аб парушэннях пераадрасаваў дырэктару фірмы, папрасіўшы інспектара растлумачыць на гэты конт, якія дакументы павінны быць у наяўнасці.

### Лічба

З пачатку года ў Мінску і Мінскай вобласці былі агледжаны 39 аўтамабіляў, выяўлена 81 парушэнне, выдадзены 22 прадпісанні на выпраўленне парушэнняў кіроўцам таксі і ўстаноўлены тэрміны іх выканання. Спецыялісты інспекцыі перыядычна праводзяць кантрольныя мерапрыемствы ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам па падатках і зборах, ДАІ і іншымі кантралюючымі органамі. Праверкі праходзяць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

А не шкодзь!

## ГУЧНЫ РЭЗАНАНС «ЦІХАГА» БРАКАНЬЕРСТВА

**З пачатку лютага выяўлена больш за 30 фактаў незаконных паляванняў з выкарыстаннем забароненых прылад. Канфіскавана 290 петляў і 27 капканаў, паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.**



Так, у ходзе палявога мерапрыемства работнікамі Глыбоцкай міжраённай інспекцыі выяўлены факт незаконнага палявання з выкарыстаннем петляў і капканаў жыхаром вёскі Мястэчка Пастаўскага раёна, які быў затрыманы ў момант праверкі дзвюх устаноўленых ім петляў. Побач па слядах знайшлі яшчэ пяць петляў напагатове і капкан, а таксама месца разбору здабытых пры дапамозе петляў казулі і зайца. Пазней у доме парушальніка выявілі і мяса казулі (каля 15 кілаграмаў), пасля чаго затрыманы прызнаўся ў браканьерстве. Але і гэта не ўсё: высветлілася, што грамадзянін устанавіў яшчэ чатыры капканы. У дачыненні да яго Пастаўскім РАУС распачата крымінальная справа, а таксама складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні за незаконную здабычу зайца.

Характэрна, што ў гэты ж дзень па слядах на снезе быў устаноўлены яшчэ адзін аматар «ціхага» браканьерства, які ўстанавіў тры капканы. Ім быў... сын названага вышэй грамадзяніна.

Абодва парушальнікі, і бацька, і сын, раней траплялі ў поле зроку інспектараў і прыцягваліся да адказнасці за незаконнае паляванне, захоўванне незарэгістраванай паляўнічай зброі, забароненых прылад палявання і рыбалоўства.

Работнікамі Нясвіжскай міжраённай інспекцыі ўстаноўлены факт незаконнага палявання жыхаром вёскі Каранеўшчына Клецкага раёна, які ўстанавіў капканы і здабыў чатыры асобіны зайца. У домаўладанні грамадзяніна выяўлена і канфіскавана 54 пятлі з металічнага троса, два капканы, незарэгістраваная паляўнічая стрэльба, порах і патроны, а таксама забароненыя прылады рыбалоўства — 15 сетак даўжынёй больш за 400 метраў. Вырашаецца пытанне аб завядзенні ў дачыненні да парушальніка крымінальнай справы. Факту незаконнага захоўвання незарэгістраванай паляўнічай зброі таксама будзе дадзена прававая ацэнка.

Жыхар вёскі Стуканы Глыбоцкага раёна таксама абвінавачаны ў незаконным паляванні з выкарыстаннем двух капканаў і пятлі. У ходзе разбору парушальнік выдаў інспектарам яшчэ чатыры пятлі, а таксама незарэгістраваную гладкаствольную стрэльбу. У дачыненні да грамадзяніна складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні.

Мазырскай міжраённай інспекцыяй вядзецца адміністрацыйны працэс у дачыненні да жыхара вёскі Кошчычы Калінкавіцкага раёна, які вёў «ціхае» паляванне з выкарыстаннем 14 петляў і незаконна здабыў дзве асобіны зайца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта Дзяржінспекцыі.**

Ну і ну!

## УКРАЛІ ПОСУД У СУСЕДЗЯЎ ПА ІНТЭРНАЦЕ

### Каб было на што працягнуць застолле

**У аператыўна-дзяжурную службу Барысаўскага РУУС па дапамогу адначасова звярнуліся чатыры заяўнікі. З шафы агульнай кухні ў інтэрнаце па вуліцы М. Горкага невядомыя ўначы ўкралі іх кухонны посуд. Што характэрна, зніклі выключна металічныя прадметы: патэльні, гусятніца і каструлі. Падрабязнасці гэтай незвычайнай гісторыі паведамляе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Барысаўскага РУУС.**

Праваахоўнікі, якія прыбылі на месца здарэння, правялі абход па пакоях грамадзян для ўстанаўлення магчымых сведак і відавочцаў. Неўзабаве ў ходзе аператыўных мерапрыемстваў асобы падазраваных былі ўстаноўлены — імі аказаліся 33-гадовы барысаўчанін і яго 30-гадовая спадарожніца. У біяграфіі мужчыны, дарэчы, гэта не першы падобны крадзеж.

Крымінальны дуэт прызнаўся ў зробленым, растлумачыўшы, што ў той дзень яны прыйшлі ў госці ў інтэрнат да свайго знаёмага для сумеснага ўжывання спіртнога. Аднак алкаголь хутка скончыўся, а грошай для працягу бяседы ні ў кога не было. Вось госці і адважыліся на крадзеж посуду. Украдзенае парачка адразу ж аднесла на адзін з нарыхтоўчых пунктаў горада. На чужых патэльнях атрымалася зарабіць 15 рублёў, якія ў гэты ж дзень спусцілі на спіртное.

У дачыненні да барысаўчан заведзена крымінальная справа, ім пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЗАВЯШЧАННІ, ДАВЕРАНАСЦІ, ЗГОДЫ...

## Якія дакументы натарыус аформіць у канторы, на выездзе ў аграгарадок і дома

**Са студзеня натарыусы выязджаюць працаваць у аграгарадкі згодна з новымі правіламі. А сельсаветы, якія маглі па некаторых пытаннях замяняць натарыусаў, вызвалілі ад паловы гэтых дадатковых функцый. Змены скіраваны на ўдасканаленне афармлення найперш такіх сур'ёзных дакументаў, як завяшчанне, даверанасць і згода, расказала пра асаблівасці змяненняў Радміла ШЧЫРАЯ, намеснік старшыні Мінскай абласной натарыяльнай палаты.**



### НАТАРЫЯЛЬНА ЗАВЕРАНЫ І ПРОСТА ЗАСВЕДЧАНЫ: У ЧЫМ РОЗНІЦА?

У населеным пункце, дзе няма натарыуса, службовыя асобы мясцовых выканкамаў (сельскіх і пасялковых) маюць права ажыццяўляць некаторыя натарыяльныя дзеянні. Са студзеня з кампетэнцый мясцовых выканкамаў пэўныя натарыяльныя дзеянні выключылі, і выезды натарыусаў у аграгарадкі сталі больш актуальныя. Хоць і да змяненняў натарыусы таксама выязджалі ў аграгарадкі, расказала Радміла Шчырая:

*— Службовыя асобы мясцовых выканкамаў (у большасці сваёй гэта кіраўнікі спраў ці, як іх раней называлі, сакратары) і цяпер могуць ажыццяўляць некаторыя натарыяльныя дзеянні: натарыяльна сведчыць подпіс на дакуменце, завяраць копію ці выпіску з дакумента, выдаць дублікат пэўнай афіцыйнай паперы, якая маецца ў выканкаме, гэтаксама, як і натарыусы. А вось* ***натарыяльна сведчыць даверанасць, завяшчанне і згоду цяпер могуць толькі натарыусы.***

Варта звярнуць увагу, што, згодна са змяненнямі, якія дзейнічаюць з 3 студзеня, даверанасці на атрыманне пенсіі ці дапамогі можна зрабіць у сельвыканкаме, але яны ўжо не будуць лічыцца натарыяльна заверанымі дакументамі. Тым не менш атрымліваць па гэтых паперах грошы павераны зможа.

### ЧАМУ СПАТРЭБІЛІСЯ ЗМЯНЕННІ?

Рашэнне вывесці з кампетэнцый сельвыканкамаў некаторыя натарыяльныя дзеянні прадыктавана практыкай, заўважыла спецыяліст:

*— Натарыусы і кіраўнікі спраў — людзі розных кампетэнцый. У апошніх далёка не заўсёды ёсць юрыдычная кваліфікацыя, і натарыяльныя абавязкі былі для іх дадатковай нагрузкай. А нам бы хацелася, каб людзі атрымлівалі кваліфікаваную дапамогу, асабліва ў пытаннях завяшчанняў, бо тут вельмі высокая цана памылкі. Калі падчас складання гэтага дакумента дапускаецца памылка ці выяўляецца недахоп, то выправіць гэта практычна немагчыма. Здаралася, што з-за гэтага спадчыннікі не маглі рэалізаваць свае правы нават праз суд і не атрымлівалі таго, на што разлічвалі.*

### ЯК ЗАМОВІЦЬ ПРЫЕЗД НАТАРЫУСА ДАДОМУ?

Праз памяншэнне кампетэнцый асоб сельвыканкамаў павялічылася, адпаведна, колькасць выездаў натарыусаў у аграгарадкі і іншыя населеныя пункты, дзе адсутнічаюць натарыяльныя канторы і бюро, аднак ёсць мясцовы распарадчы орган (сельсавет). У гэтым населеным пункце павінны існаваць умовы для натарыяльнай дзейнасці.

За ўсімі натарыяльнымі канторамі і бюро тэрытарыяльнымі натарыяльнымі палатамі замацаваны аграгарадкі адпаведна з месцам іх размяшчэння. Падчас фарміравання графіка выездаў ацэньваецца запатрабаванасць у натарыяльных паслугах у пэўным населеным пункце. Найбольш часта да натарыуса звяртаюцца, дарэчы, з пытаннямі завяшчанняў і даверанасцяў.

*— Перш чым фарміраваць графікі выезду (яны складаюцца штоквартальна), спецыялісты абмяркоўваюць зручнасць дат і наяўнасць месцаў для прыёму грамадзян з мясцовымі органамі ўлады ў вёсках і аграгарадках, —* акрэсліла Радміла Шчырая. *— Калі такіх умоў няма, а чалавеку патрэбна натарыяльная дапамога, то* ***існуе такі варыянт, як выезд натарыуса да месца знаходжання зацікаўленай асобы.*** *Такую сустрэчу таксама можна спланаваць і наведаць гэтага грамадзяніна падчас выязнога прыёму ў аграгарадку. Або проста ў пэўны дзень прыехаць да яго дахаты ці нават у бальніцу, калі яму цяжка дабрацца да натарыуса не толькі ў кантору, але і падчас прыезду спецыяліста ў сельсавет.*

**«Як паведаміў Артур СТРЭХ, намеснік старшыні Беларускай натарыяльнай палаты, толькі за студзень 2021-га натарыусы выязджалі ў аграгарадкі па ўсёй краіне ўжо 117 разоў».**

**Каб пакінуць заяўку на сустрэчу з натарыусам** (падчас яго выезду па графіку ў аграгарадок), чалавек можа пазваніць у натарыяльную кантору, якая размяшчаецца згодна з месцам яго пражывання (у райцэнтры), даслаць ліст або напісаць на электронную пошту. І калі будзе хоць адна заяўка, натарыус прыедзе па графіку (раней для выезду патрабавалася не менш як пяць заяў ад людзей). Калі раптам ніводнай заяўкі не будзе, то запланаваны выезд у аграгарадок не адбудзецца, навошта?

**Ёсць і выключэнні для выезду па-за межамі графіка,** калі паступае заяўка ад удзельніка Вялікай Айчыннай вайны ці асобы з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. Натарыус прыедзе ў пэўны дзень, і тады ж да спецыяліста могуць падысці і іншыя грамадзяне.

### ЯКІЯ ДАКУМЕНТЫ ТРЭБА МЕЦЬ?

Калі чалавек прыходзіць да натарыуса падчас яго выезду, гэта тое ж самае, калі б асоба звярнулася ў натарыяльную кантору. Патрэбныя дакументы, як правіла, афармляюцца на месцы. Нейкага ўніверсальнага набору папер, якія трэба мець пры сабе, няма, усё залежыць ад пытання, з якім прыйшоў чалавек, падкрэсліла спецыяліст:

*— Каб аформіць завяшчанне ці даверанасць, фактычна дастаткова мець пры сабе пашпарт і пенсійнае пасведчанне (калі гаворка ідзе пра льготы). Калі трэба зрабіць больш складаныя дакументы, напрыклад аформіць дарэнне нерухомасці, то чалавек атрымае кансультацыю, а неабходныя для гэтага паперы могуць быць запытаны, па яго просьбе, у адпаведных інстанцыях. Натарыус завядзе папярэднюю справу, ці, як кажуць, «справу аднаго акна». Калі ўсе дакументы будуць сабраныя, чалавека праінфармуюць і запануюць яшчэ адну сустрэчу, каб канчаткова ажыццявіць натарыяльнае дзеянне. Гэта можна зрабіць у натарыяльнай канторы згодна з графікам выезду натарыуса або ў межах выезду спецыяліста да месца знаходжання зацікаўленай асобы (дадому).*

### КОЛЬКІ КАШТУЕ ПАСЛУГА?

Чалавек аплачвае натарыяльны тарыф за ажыццяўленне пэўных натарыяльных дзеянняў. Робіцца гэта па факце работы натарыуса праз банк, пошту, сістэму АРІП. Калі натарыус вядзе прыём у аграгарадку ці выязджае да чалавека дадому, а аплаціць паслугу праз установы асобе складана, то **натарыус можа ўзяць у яго наяўныя грошы і выпісаць квітанцыю ўстаноўленага ўзору.**

# Медыяцыя да суда, падчас яго і замест

**Летам 2020-га са змяненнямі ў заканадаўстве аб медыяцыі былі пашыраны паўнамоцтвы бакоў па прымяненні працэдуры медыяцыі. Заключаць пагадненне канфліктуючыя бакі могуць як да суда, так і падчас знаходжання справы ў судовай інстанцыі. Сёлетнія ж новаўвядзенні дазволілі прымяняць медыяцыю падчас вырашэння міжнародных камерцыйных спрэчак, а студэнтам — вучыцца на медыятара (раней гэта маглі рабіць толькі людзі з вышэйшай адукацыяй).**

У Беларусі працуюць 924 медыятары, кожнага з якіх можна знайсці ў Рэестры медыятараў на сайце Міністэрства юстыцыі. Тут жа можна даведацца, на вырашэнні якіх канфліктаў (сямейных, працоўных, камерцыйных) спецыялізуецца медыятар. Адметнасць работы медыятара ў тым, што ён не прапануе гатовых рашэнняў, а стварае атмасферу для размовы канфліктуючых, каб тыя самі маглі вынайсці рашэнне, якое задаволіць усіх.

Хоць медыяцыйнае пагадненне дасягаецца добраахвотна з удзелам абодвух варагуючых бакоў, выконваць яго ўмовы хтосьці з удзельнікаў канфлікту можа не захацець. У такім разе прыцягнуць адказніка да выканання пагаднення можна прымусова, звярнуўшыся ў суд па выдачу выканаўчага дакумента на падставе медыяцыйнага пагаднення.

Нават калі права ўжо разглядаецца ў судзе, спрачальнікі могуць заключыць дамову аб прымяненні медыяцыі. А ўжо пасля вырашаць: перапыніць вядзенне па справе альбо пакінуць заяву без разгляду. У апошнім выпадку ім поўнасцю вернуць кошт дзяржаўнай пошліны, выплачанай за падачу заявы пры звароце ў суд, пракаментавалі ў Міністэрстве юстыцыі.

Змяненні ў законы па пытаннях медыяцыі, якія запрацавалі ў Беларусі з 15 студзеня, дазволілі суб'ектам гаспадарання самім выбіраць сродак для ўрэгулявання спрэчак у міжнародных эканамічных адносінах. Цяпер у заканадаўстве аб медыяцыі вызначана, якое пагадненне з'яўляецца міжнародным медыяцыйным пагадненнем і якія ўмовы павінны быць вытрыманы падчас яго заключэння. Новаўвядзенне скіравана, у прыватнасці, на стварэнне прававога механізму прызнання і выканання на тэрыторыі краіны міжнародных медыяцыйных пагадненняў, якія дасягнуты ў выніку пазасудовай медыяцыі.

Каб стаць медыятарам, неабходна прайсці сур'ёзную падрыхтоўку, якая ўключае ў сябе шмат прававой і псіхалагічнай інфармацыі, і прэтэндаваць на такую вучобу маглі толькі асобы з вышэйшай адукацыяй. Пры гэтым, як паказвае практыка, нават пасля завяршэння навучання не ўсе адважваюцца трымаць экзамен на права атрымаць пасведчанне медыятара. З гэтага ж года вучыцца на медыятара дазволілі і студэнтам ВНУ. Аднак права на атрыманне пасведчання медыятара ў такіх навучэнцаў з'явіцца толькі пасля атрымання імі вышэйшай адукацыі.

**Ірына СІДАРОК.**

Да адказу

# Зарплаты «ў канвертах» і ўхіленне ад падаткаў у буйным памеры

## Бабруйскае камерцыйнае рэкламнае прадпрыемства абвінавачваецца ў сур'ёзных парушэннях беларускага заканадаўства

Іх выявіла ўпраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці падчас сумеснай праверкі з КДК Магілёўскай вобласці.

— Устаноўлена, што нароўні з афіцыйнай зарплатай работнікам фірмы выплачваліся таксама грошы «ў канвертах», без адлюстравання іх па ўліку прадпрыемства і выплаты падаходнага падатку, — паведаміў падрабязнасці **начальнік упраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — Такім чынам, за перыяд з чэрвеня 2016 года да верасня 2020-га больш чым 100 работнікаў фірмы атрымала «ў канвертах» сродкаў на агульную суму звыш мільёна рублёў. Сума нявыплачанага ў бюджэт падаходнага падатку склала больш як 135 тысяч рублёў. Акрамя таго, у дзейнасці прадпрыемства выяўлены факты штучнага драблення бізнесу і неправамернага выкарыстання ў гэтых мэтах спрошчанай сістэмы падаткаабкладання. Выручка за зробленую рэкламу размяркоўвалася паміж галаўной фірмай і афіліраваным з ёй камерцыйным прадпрыемствам, фактычнае кіраванне якім ажыццяўляла тая ж самая асоба. Абодва суб'екты гаспадарання былі аб'яднаныя адным кіраўніцтвам, адным мэтамі, удзелам ва ўстаўных фондах, работнікамі, дагаворнымі адносінамі і нефармальнымі дамоўленасцямі, якія дазвалялі стварыць бачнасць законнага прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання. Шкода дзяржаве за кошт нявыплачанага падатку на дабаўленую вартасць за 2018—2020 гады склала больш за 650 тысяч рублёў.

У мэтах пагашэння нанесенай дзяржаве шкоды на маёмасць прадпрыемства (рэкламныя шчыты, сіці-лайт і іншае) агульным коштам больш чым 200 тысяч рублёў накладзены арышт. З улікам сабраных работнікамі органаў фінансавых расследаванняў матэрыялаў за ўхіленне ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры ўпраўленнем Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці ў дачыненні да службовых асоб прадпрыемства распачата крымінальная справа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# НЕ З ЛАБАРАТОРЫІ, А АД КАЖАНОЎ

## Эксперты СААЗ — пра найбольш верагоднае паходжанне і больш ранні час успышкі каранавіруса

**По меншай меры, тысяча чалавек была заражана 13 рознымі штамамі новага каранавіруса ва Ухані ў снежні 2019 года, калі там упершыню была зафіксавана ўспышка інфекцыі. Пра гэта распавёў кіраўнік міжнароднай экспертнай групы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), спецыяліст па заанозных (якія перадаюцца чалавеку ад жывёл) інфекцыях і харчовай бяспецы Пітэр Бэн Эмбарэк, перадае ТАСС. Яшчэ адзін эксперт, доктар Пітэр Дасзак, расказаў, што першапачаткова каранавірус мог быць распаўсюджаны кажанамі на поўдні Кітая і ў Паўднёва-Усходняй Азіі. Нагадаем, што місія СААЗ вывучае паходжанне каранавіруса ў Кітаі.**

Каранавірусная інфекцыя ад кажаноў трапіла на ферму з дзікімі жывёламі, дзе ёю маглі заразіцца віверы, тхары, барсукі, янотападобныя сабакі. «Альбо людзі, якія працавалі на ферме, заразіліся і завезлі вірус на рынак, альбо яны паставілі на рынак заражаных жывёл», — дадаў Дасзак. Далейшае распаўсюджванне каранавірус атрымаў пасля таго, як трапіў на рынак у Хуанань або ва Ухань, заключыў ён.

Раней французскі вірусолаг, нобелеўскі лаўрэат Люк Мантанье выказаў тэорыю пра тое, што новы тып каранавіруснай інфекцыі распрацавалі ў лабараторыі ў Кітаі. Місія СААЗ, у сваю чаргу, выключыла верагоднасць таго, што каранавірус мае штучнае паходжанне. Спецыялісты пацвердзілі версію, што першапачаткова каранавірус цыркуляваў сярод кажаноў.



А на момант выяўлення гэтага новага для чалавека захворвання, пра што Кітай заявіў у снежні 2019 года, вірус ужо актыўна цыркуляваў. Па выніках работы місіі СААЗ было выяўлена, што па стане на снежань 2019 года ва Ухані налічвалася, прынамсі, 13 розных мутацый каранавіруса. «Некаторыя з іх пачалі распаўсюджванне з мясцовых рынкаў, а некаторыя ніяк не звязаныя з рынкамі», — удакладніў Эмбарэк. Ён не адважыўся сцвярджаць, што звесткі аб некалькіх варыянтах інфекцыі непасрэдна сведчаць пра больш ранні, чым меркавалася, час узнікнення ўспышкі інфекцыі.

Газета The Wall Street Journal раней паведамляла са спасылкай на экспертаў місіі СААЗ, што каранавірус пачаў распаўсюджвацца на тэрыторыі Кітая ў кастрычніку 2019 года, а не ў снежні, як сцвярджалася раней. Па звестках выдання, экспертам удалося ўстанавіць, што ў кастрычніку 2019 года на тэрыторыі Цэнтральнага Кітая былі шпіталізаваны 92 чалавекі з сімптомамі, аналагічнымі тым, што назіраюцца пры захворванні, выкліканым каранавірусам.

Скажыце, доктар...

# З ЛЮБОЎЮ І ПАВАГАЙ

## Як паводзіць сябе з блізкім, калі ў яго псіхічнае расстройства

**Навіна пра тое, што ў блізкага чалавека псіхічнае захворванне, можа прывесці да шоку. Узнікаюць збянтэжанасць і адмаўленне — «з намі такога здарыцца не магло», нават калі захварэў чалавек вельмі сталага веку. Звыклы свет руйнуецца, насоўваецца новая рэальнасць, і прыходзіцца вучыцца ў ёй жыць. Адметна, што псіхічнае захворванне прыносіць пакуты не толькі хвораму, але і яго родным, у большай ці меншай ступені закранаючы ўсіх членаў сям'і, змяняючы іх жыццё і планы на будучыню. Відавочна, пацыенту неабходныя дапамога і падтрымка ўсёй сям'і. Вельмі часта сваякі хочуць дапамагчы, але не ведаюць і не разумеюць, як. Урач — псіхіятр-нарколаг, намеснік галоўнага ўрача Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ірына ВАКУЛЬЧЫК дала ўніверсальныя рэкамендацыі, якія дазволяць аблегчыць жыццё як хворага, так і яго блізкіх.**

**ПЕРШАЕ:** паспрабуйце больш даведацца пра хваробу і пра яе праявы.

Веды дапамогуць вам правільна ставіцца да, можа быць, часам «дзіўных» паводзін і больш паспяхова спраўляцца з праблемамі, што ўзнікаюць з-за хваробы.

**ДРУГОЕ:** ведайце, чаго можна чакаць ад вашага блізкага, які мае псіхічнае расстройства.

Псіхічна хворы чалавек не зусім адэкватна ўспрымае рэчаіснасць і мае адхіленні ў паводзінах. Зносіны з такімі людзьмі таксама могуць адхіляцца ад нормаў. Галоўнае пры гэтым — памятаць, што чалавек не проста паводзіць сябе ненармальна, ён з'яўляецца хворым. Адна з асаблівасцяў заключаецца ў тым, што такія пацыенты маюць патрэбу ў працяглым назіранні і лячэнні. У працэсе лячэння сімптомы могуць то ўзнікаць, то знікаць. Вы, як і астатнія члены сям'і, павінны ведаць, чаго варта чакаць ад сваяка падчас выканання дамашніх спраў або пры зносінах з іншымі людзьмі.

**ТРЭЦЯЕ:** бярыце ўдзел у лячэнні.

Даведайцеся, якія лячэбныя праграмы лепш за ўсё дапамагаюць пры дадзеным захворванні, і пераканайцеся родная чалавека ўзяць у іх удзел. Сачыце за тым, каб ён прымаў прызначаныя яму лекі, і, калі перастае прымаць іх, прафармуйце ўрача. Паведамляйце таксама, якія лекі найлепш дапамагаюць.

**ЧАЦВЁРТАЕ:** дапамагайце пазбягаць стрэсаў.

Людзям, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў, цяжка пераносіць сітуацыі, калі на іх крычаць, раздражняюцца або патрабуюць зрабіць тое, што яны не ў стане выканаць. Вы можаце дапамагчы блізкаму пазбягаць стрэсаў, калі будзеце прытрымлівацца простых правіл:

— размаўляйце з ім спакойна, не кажыце таго, што можа вывесці яго з сябе, заслужана хваліце за добрыя справы;

— не спрачайцеся і не спрабуйце адмаўляць існаванне праяў хваробы, якія вы, магчыма, не бачыце ці не чуеце;

— майце на ўвазе, што звычайныя падзеі — пераезд на новае месца жыхарства, шлюб ці нават хатняя ўрачыстасць — могуць выводзіць з раўнавагі пацыентаў з псіхічнымі расстройствамі.

**ПЯТАЕ:** звыклы распарадак.

Важным момантам, які стабілізуе стан хворага чалавека, з'яўляецца захаванне звыклага, простага жыццёвага распарадку ў доме, напрыклад, стабільнага часу пад'ёму па раніцах, часу сну, гадзін прыёму ежы. Неабходна стварыць спакойнае, паслядоўнае, максімальна прадказальнае жыццё. Гэта дасць магчымасць хвораму чалавеку справіцца з пачуццём трывогі, разгубленасці, зразумець, што і ў які час вы ад яго чакаеце.

**ШОСТАЕ:** паводзьце сябе спакойна.

Вы павінны памятаць, што чалавек, які мае псіхічнае захворванне, можа адчуваць моцныя перажыванні, думкі яго могуць блытацца, цячы занадта павольна або, наадварот, хутка. Размаўляючы з ім, асабліва ў перыяды пагаршэння стану, важна навучыцца паводзіць сябе спакойна і стрымана. Гэта спрыяе стабілізацыі псіхічнага стану, а ў некаторых выпадках нават дапамагае хвораму супакоіцца і справіцца з трывогай.

**СЁМАЕ:** навучыцеся распазнаваць сімптомы хваробы.



Ёсць некалькі характэрных асаблівасцяў хворых, на якія трэба правільна рэагаваць. Калі ў блізкага цяжкасці з канцэнтрацыяй увагі, вы павінны гаварыць коратка, паўтараць сказанае. Калі ў яго ўзнікаюць раздражняльнасць, гнеў, не трэба спрачацца, абвастраць дыскусію, варта на нейкі час абмежаваць зносіны. Калі вы чуеце неадэкватныя меркаванні і выказванні, не разлічвайце на рацыянальнае абмеркаванне і не спрабуйце пераканаць. Калі чуеце ўвогуле вар'яцкія перакананні, не спрачайцеся, але і не падтрымлівайце іх.

Характэрныя для такіх людзей і ваганні эмоцый — не прымайце іх на свой рахунак, памятайце, што гэта не капрызы, а праявы хваробы. Адчуваеце з боку такога блізкага мала спагады да іншых і эмацыянальную халоднасць — зноў-такі, разглядайце іх як сімптом псіхічнага захворвання. Калі ваш блізкі праяўляе замкнёнасць, пачынайце размову першым, старайцеся ўцягнуць яго ў гутарку. Калі ён адчувае страх, захоўвайце спакой і пастарайцеся супакоіць хворага. У выпадку няўпэўненасці ў сабе і нізкай самаацэнкі стаўцеся паважліва, падтрымлівайце пазітыўны настрой.

**ВОСЬМАЕ:** адзначайце нават невялікія поспехі.

Важна ставіць сапраўды рэальныя мэты. Устаць з ложка, апрануцца, пачысціць зубы, памыць за сабой посуд — гэта не так мала. Адзначайце нават такія поспехі, бо з гэтых цаглінак будуецца самаацэнка. Трэба навучыцца знаходзіць тыя ці іншыя станоўчыя прыкметы, а часам і проста словы падтрымкі ў крызісныя перыяды хваробы. І калі хворы чалавек сам звярнуў увагу на набліжэнне сімптомаў абвастрэння стану і вырашыў легчы ў бальніцу, вельмі карысна будзе падтрымаць яго.

**ДЗЯВЯТАЕ:** ніколі не страчвайце надзеі на выздараўленне, будзьце аптымістычныя.

Вельмі важна і адначасова вельмі цяжка не траціць надзеі на выздараўленне. Часта хранічна хвораму чалавеку даводзіцца нялёгка, хваравіты стан можа доўжыцца месяцы і гады, адбіраючы надзею на выздараўленне ці хоць бы на істотнае аблягчэнне стану.

Таму заахвочвайце актыўнасць хворага чалавека, яго самастойнасць, імкненне да дзейнасці, старайцеся выбудаваць адносіны такім чынам, каб ён не прыняў у жыцці пасіўную ролю, абвясціўшы сябе інвалідам і адмовіўшыся ад выканання сваіх абавязкаў. Вельмі важна, каб чалавек, які пакутуе ад псіхічнага расстройства, імкнуўся да максімальна незалежнага жыцця.

**ДЗЯСЯТАЕ:** праяўляйце любоў і павагу.

Не забывайце, што ваш блізкі часта трапляе ў непрыемныя сітуацыі і часам дрэнна ставіцца да самога сябе з-за хваробы. Сваімі штодзённымі паводзінамі паказвайце, што ён нягледзячы ні на што застаецца для вас паважаным і любімым членам сям'і. Стаўцеся да хворага чалавека з павагай і любоўю, нават калі вы некалькі разоў за раніцу нагадваеце яму аб тым, што трэба пачысціць зубы, падмесці ў пакоі, пераапрануцца, прыбраць за сабой посуд. Ніколі не абражайце пачуццё ўласнай годнасці хворага чалавека!

Здаровым членам сям'і варта памятаць, што іх уласны дабрабыт прынцыпова важны: чым лепш яны сябе адчуваюць, тым лепш жывецца не толькі ім самім, але і хвораму. Таму варта засцерагчы сябе ад «выгарання». Чым больш клопату патрабуецца хвораму, тым больш падтрымкі трэба блізкім членам сям'і.

Можна паспрабаваць размеркаваць клопат аб хворым паміж некалькімі сваякамі. Можна знайсці дапамогу ў групах падтрымкі: падтрымліваць зносіны і абменьвацца вопытам з іншымі сем'ямі, што сутыкаюцца з падобнымі цяжкасцямі.

Памятайце, што аптымальныя паводзіны сям'і ў адносінах да хворага прадугледжваюць захаванне балансу паміж неабходнай дапамогай і клопатам, з аднаго боку, і пакіданнем хвораму дастатковай самастойнасці і незалежнасці, з іншага. Падобны баланс павінен быць заснаваны на добрым разуменні магчымасцяў і абмежаванняў, якія накладвае хвароба. Дапамагчы ў гэтым сям'і зможа цярпенне, а веды пра хваробу і лячэнне, падтрымка спецыялістаў і навакольных з'яўляцца паступова.

# Вучыць і вучыцца пераадоленню

## Велааматар і мастак Валянцін Балдэнка, які паўсвету аб'ехаў на ровары, больш за 20 гадоў займаецца рэабілітацыяй людзей з абмежаванымі магчымасцямі



**Валянцін Васілевіч вялікі аптыміст па натуры, ён умее заўважаць вакол сябе прыгожае, любіць людзей, унушае сімпатыю з першых некалькіх фраз. Нехта абавязкова падкрэсліць, дзівак, маўляў. Ну вось, скажам, на сустрэчу са мной ён прыехаў на ровары, у Брэсце ў той дзень было мінус 17. Гэта проста такі лад жыцця ў яго, яму іншы транспарт не патрэбны, прычым, у любое надвор'е. Можа, таму ў свае 67 ён поўны сіл, ідэй, праектаў на стадыі рэалізацыі, у яго шмат таварышаў, аднадумцаў, адным словам, работы столькі, што старэць няма часу.**

### Першы клуб падарожнікаў

Па адукацыі і асноўнай прафесіі Валянцін мастак. Ён скончыў Краснадарскі дзяржаўны ўніверсітэт. У савецкі час выстаўляўся і ў Краснадары, і, пазней, у Беларусі. Але як большасць мастакоў, зарабляў па першым часе нагляднай агітацыяй. У Брэст з паўднёвых шырот сям'я пераехала па празаічнай прычыне — у жонкі пачалася алергія на асобныя кубанскія расліны. А тут жылі браты Валянціна, ураджэнца Бабруйска, сюды нярэдка ездзілі ў госці, вось і выбралі горад бліжэй да родных, ды і цяплей тут, чым, скажам, на поўначы краіны.

Вялікі аматар велападарожжаў, які свой першы ровар купіў за грошы, зароблены ў студэнцкім будатрадзе, адразу ж запісаўся ў абласны веласіпедны клуб. Але вось наездзіцца па Савецкім Саюзе не паспелі, вялікая краіна адышла ў нябыт. Неўзабаве з-за фінансавых праблем развальўся і клуб.

Тады няўрымслівы Балдэнка рашаецца стварыць сваю веласіпедную арганізацыю. Па падказцы падатковай інспекцыі зарэгістравалі як прыватнае прадпрыемства. У лютым 1995-га, на першы сход прыйшло 22 велааматары. Было прынята рашэнне стварыць вытворча-турыстычнае прадпрыемства «Клуб велатурызму і падарожжаў». Каб зарабіць грошы на падарожжы, займаліся адстройваннем на будоўлі, вазілі цэглу з Гродна на продаж, не цураліся ніякай работы. І вандравалі па свеце. Пры гэтым усяляк стараліся пра сябе заявіць, за мяжой расказаць пра Беларусь. Гарвыканкам падтрымліваў такую народную дыпламатыю. Аднойчы нават трапілі на велавыстаўку ў Берлін. Так турыстычны Захад даведаўся пра веласіпедыстаў з Брэста.

### Чарнобыльскі марафон з калясачнікамі

Прыкладна ў гэты ж час давялося забраць да сябе з Краснадара бацьку-франтавіка, якому з-за хваробы ампутавалі абедзве нагі. Змайстраваў механізм, каб чапляць інвалідную каляску да ровара, і вазіў бацьку на прагулкі ў лес. А калі родны чалавек пасяліўся ў Доме ветэранаў, убачыў наглядна маштабы праблемы: вакол жыве мноства людзей, якія не могуць рухацца самастойна. Валянцін пачаў вазіць бацькавых суседзяў па Доме ветэранаў, які размяшчаўся па вуліцы Гродзенскай. Тады ж ён упершыню задумаўся, што трэба дапамагаць інвалідам, і не толькі ўзросту ветэранаў, але і маладым, якія сядзяць дома.

Першы, з кім пазнаёміўся ў абласным таварыстве інвалідаў, быў інструктар па спорце Іван Шмыга. Аднадумцаў адзін у адным адчулі з першага погляду і першых слоў. Валянцін Балдэнка тады рыхтаваўся да міжнароднага веламарафону па Беларусі, прысвечанага 10-годдзю чарнобыльскай катастрофы. Дык вось, неяк адразу ўзнікла ідэя прыцягнуць да справы інвалідаў. Знайшлі самых адважных добраахвотнікаў. Адным словам, у паездку разам са здаровымі веласіпедыстамі адправіліся пяцёра людзей з абмежаванымі магчымасцямі, двое з якіх — Ірына Мохава і Наталля Курэпіна — калясачніцы. Для іх быў прадугледжаны запасны варыянт, групу суправаджаў аўтобус, і ў любы момант дзяўчаты маглі сысці з дыстанцыі. Але яны не здаліся, усё пераадолелі! Роўна 500 кіламетраў дарогі вытрымалі, праехалі ў калясках, якія былі прымацаваны да ровараў.

— Групу вельмі цёпла сустракалі ў розных гарадах. У Століне, — згадаў Валянцін, — Ірыну Мохаву, якая чытала свае вершы, проста засыпалі кветкамі.

### Непратаптаным шляхам

Пасля гэтай паездкі стала ясна, што работу з інвалідамі трэба працягваць, людзей неабходна выцягваць з чатырох сцен, вучыць іх не зацыклівацца на сваіх хваробах. Разам з дырэктарам «Цэнтра маладзёжнай ініцыятывы» Васілём Барысавым, які мае турбазу «Спадарожнік» на беразе Белага возера ў Брэсцкім раёне, распрацавалі праграму 10-дзённага курса рэабілітацыі.

— Праўда, гэтых дзяўчат і хлопцаў першы раз ледзь не сілай даводзілася выцягваць з кватэр, — згадвае Валянцін Васілевіч. — Сказаць, што яны адчувалі сябе некамфортна, калі прыехалі, амаль нічога не сказаць. Яны баяліся, бо не было вопыту камунікацый з равеснікамі, яны саромеліся сваіх хвароб, калецтва, яны выглядалі разгубленымі і прыгнечанымі. Але за дзесяць дзён, мы самі нават не чакалі такога выніку, маладыя людзі перамяніліся. Ну, напрыклад, у праграме была своеасаблівая паласа перашкод. І калі першы раз прайшлі гэтую сцяжыну па гразі і купінах не толькі з нашай дапамогай, але і дапамагаючы адно аднаму, а потым дзяліліся ўражаннямі, то адна дзяўчына сказала: «У той грязі мне часам хацелася вас забіць, Валянцін Васілевіч, а цяпер я шчаслівая, бо мы ўсе перадолелі той участак, па якім і здароваму не вельмі проста прайсці!» І я зразумеў, што правільную тактыку выбраў.

Развіталіся ледзь не са слязамі, бо навучыліся ўсміхацца, адкрыта выяўляць свае эмоцыі, пачуцці. Нам было радасна не менш за іх, — успамінае ён.

Пасля гэтага сустрэчы сталі рэгулярныя, маладыя людзі ўжо прасіліся на турбазу. Яны знаёміліся там, нехта закахаўся і стварыў сям'ю, пачалі нараджацца дзеці. Так паступова ўтваралася грамадская арганізацыя «Інвалід і асяроддзе», у якой аб'ядналіся керамічная майстэрня для інвалідаў, рэабілітацыйная турбаза на Белым возеры і велаклуб.

Для інвалідаў, якія аб'ядналіся, пачаўся новы ўзровень жыцця. Заявіў пра сябе тэатральны фестываль «Непратаптаны шлях». Людзі з абмежаванымі магчымасцямі адкрывалі ў сабе таленты, іх спектаклі карыстаюцца заслужанай сімпатыяй гледачоў. Фестываль ужо мае сваіх аматараў, на фэст з'язджаюцца аналагічныя тэатры з розных краін. Праўда, апошнім часам ён не праводзіцца з-за пандэміі. Але ж усе самадзейныя артысты вераць, што хутка эпідэмія пойдзе на спад, і яны зноў выйдуць на сцэну.



Парыж — Масква.

А летась маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Інвалід і асяроддзе» стварыла інклюзіўны цэнтр прасоўвання здаровага спосабу жыцця ў двары па вуліцы Машэнскага. Грошы на абсталяванне выдзеліў Еўрасаюз у рамках праекта «БЕЛМЕД». Цяпер на дваровай пляцоўцы займацца на трэнажорах, гуляць у валейбол і іншыя рухавыя гульні могуць не толькі інваліды, але і ўсе ахвотныя.

### Першапраходзец міжнародных маршрутаў

Для Валянціна Балдэнкі работа з інвалідамі гэта ўжо неад'емная частка жыцця. Пачынаючы з 1999 года згаданая арганізацыя атрымала 15 малых грантаў пасольстваў Фінляндыі, Швецыі, правяла веламарафоны, рэалізавала экапраграмы ЗША, Германіі, Польшчы, ПРААН для веласіпедыстаў, якія ў шчэпцы з інвалідамі калясках займаліся рэабілітацыяй людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Адным словам, велападарожжы для інвалідаў сталі магчымыя, і магчымыя сталі адкрыцці прыгажосці роднага краю, яго сусветных славутасцяў і невялікіх мястэчак.

— Вось і нядаўна мы адну крыніцу для сябе адкрылі ў Пружанскім раёне, дзе пачынаецца рака Муха, — згадвае Валянцін Васілевіч.

Ну а сам ён дзе толькі ні быў на сваёй двухколавай машыне. На яго ліку — шэсць марафонаў па маршруце Парыж — Масква, на якіх Балдэнка быў каардынатарам беларускай часткі прабегу. Па Паўночнай Італіі ездзілі па месцах былых баёў пад камандаваннем Суворава ў 1799 годзе. Дадому вярталіся праз Аўстрыю і Германію. Для велааматараў з горада-пабраціма Брэста Равенсбурга арганізоўваў веласіпеднае падарожжа па Крымскім паўвостраве. На адной з замежных узнагарод канца 1990-х напісана: «Першапраходцу міжнародных веласіпедных марафонаў».



Наш першы велапрабег Брэст — Мазыр з інвалідамі прысвечаны 10-годдзю чарнобыльскай трагедыі.

### Як Алу Пугачову з 50-годдзем віншавалі

Канец 1990-х знамянальны ў яго асабістай гісторыі падарожжаў паездкай на юбілей да... Алы Пугачовай. Красавік 1999-га. «Была ў маім жыцці такая авантура, — усміхаецца Валянцін Васілевіч, — падумаў, калі прыеду на ровары за 1100 кіламетраў, можа, прымадонна ўшануе мяне сваёй увагай, дазволіць павіншаваць асабіста».

Ну і праехаў 56 гадзін ад Брэста да Масквы фактычна амаль што без перапынкаў. Па дарозе расказваў многім людзям, куды едзе, прасіў напісаць пажаданні артыстцы ў адмысловы альбом. Віншаванні і добрыя словы ад рукі пісалі калгасныя механізатары і брыгадзіры, школьныя настаўніцы і міліцыянеры з дарожных пастоў ДАІ, студэнты і пенсіянеры. Да канца паездкі альбом аказаўся цалкам запісаны. Тыя радкі вельмі кранулі Алу, калі яна пагартала запісы, абяцала пакінуць іх у асабістым музеі. Але гэта было потым.

Адразу ж з дарогі Валянціну давялося чакаць спявачку чатыры гадзіны каля гасцініцы «Расія», дзе быў прызначаны юбілейны канцэрт. Па чарзе выходзілі да яго Крысціна, Філіп Кіркораў, адміністратар, размаўлялі з ім. Ну а калі да канцэрта засталося чвэрць гадзіны, нарэшце правялі да знакамітай спявачкі. Калі ўручыў альбом, Ала Барысаўна расчулілася, сказала нешта накшталт: «Як я люблю гэтых беларусаў!» А ён, стомлены дарогай і доўгім чаканнем, так разгубіўся, што забыўся пра фотаапарат на шыі, не папрасіў нават здымак агульны зрабіць. Але ж яго затое запрасілі на канцэрт. А потым, праз некалькі месяцаў, быў канцэрт прымадонны ў Мінску, на які Валянцін Балдэнка атрымаў запрашэнне ад спявачкі, на канцэрт тады ездзіў разам з жонкай і дачкой.

Вось такі эпізод быў у адным з яго падарожжаў. Як ён сказаў: «Сустрэча доўжылася сем хвілін, а ў памяці засталася на ўсё жыццё». Пра яго тады «Комсомольская правда» пісала, захоўвае газетную выразку.

### Для студэнтаў трэцяга ўзросту

Спраў і праектаў, як ужо гаварылася, у няўрымслівага Балдэнкі многа. Ён выкладае веласіпедны турызм і выяўленчае мастацтва ў Інстытуце трэцяга ўзросту Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна. Ён і каля вытокаў гэтага Інстытута стаяў, пра што ўжо мала хто згадвае. Тады, у сярэдзіне нулявых, гэтую ідэю прывезлі з Германіі. Калегі-аднадумцы дапамаглі з дакументацыяй, падзяліліся вопытам, падтрымалі фінансава. Інстытут у Брэсце ўзнік першы ў краіне, ну а потым добрую справу падхапілі ў іншых абласцях. Цяпер да яго на занятку ў майстэрню ходзяць «студэнты» ва ўзросце, якія раптам адкрываюць у сабе мастацкія здольнасці. Некаторыя дарасталі да персанальных выставак. Да веласіпеднага турызму, як аказалася, таксама можна далучыцца на пенсіі. Многія ўжо сталі пастаяннымі ўдзельнікамі велападарожжаў. Удзельнікі маршаў не проста едуць і назіраюць, але і робяць свет вакол сябе лепшым. Таму часам даводзіцца арганізоўваць суботнікі на хаду.

Некалі яны з таварышамі спачатку ўбачылі Цар-дуб у Пажэжынскім лясніцтве Маларыцкага раёна, пачулі яго сумную гісторыю, а потым рэстаўрыравалі гэтае ўнікальнае 850-гадовае дрэва. Мясцовыя людзі расказалі, што ў пачатку 1940-х у дуб ударыла маланка, раскалола ствол, знесла верхавіну. Каб гісторыя не паўтарылася, прыдумалі громаадвод. На адным з прадпрыемстваў знайшлі патрэбную металічную крышку. Запрасілі альпініста, які праклаў шлях на вяршыню дрэва. Потым спецыялісты падняліся, зрэзалі няроўнасці, вычысцілі дупло, апусцілі туды бутэльку з пісьмом для нашчадкаў і закрылі металічным парасонам, ад якога нацягнулі дрот уніз і заземлілі яго. Дрэва расце, да яго водзяць экскурсіі.

Валянцін Балдэнка стаў адным з ініцыятараў стварэння экалагічнай сцяжыны, якую летась афіцыйна адкрывалі. Яна цягнецца ўздоўж ракі Мухавец ад Брэсцкай крэпасці да раёна Чырвоны Двор.

— Аднойчы мы з веласіпедыстамі трэцяга ўзросту ездзілі ўздоўж рэчкі і захапляліся краявідамі. І неяк сама сабой узнікла думка пра добраўпарадкаванне гэтай тэрыторыі. Тады нашу прапанову падтрымаў тагачасны губернатар Канстанцін Сумар. Ну і паступова справа зрушылася з месца, добраўпарадкаваннем займаліся розныя арганізацыі. Летась гарвыканкам разам з грамадскасцю давялі работу да лагічнага завяршэння. Зараз зялёны маршрут працягласцю пяць кіламетраў стаў надзвычай папулярны ў гараджан.

А нядаўна ездзілі ў Дамачава да інваліда-калясачніка, які з дапамогай сяброў уладкаваў уласны дом. Чым больш працую з гэтымі людзьмі, тым больш імі захапляюся. Людзі з абмежаванымі магчымасцямі вельмі часта выглядаюць мацнейшымі за нас, здаровых, — сказаў Валянцін Балдэнка і заспяшаўся на адкрыццё выстаўкі сваёй «студэнткі».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва Валянціна БАЛДЭНКІ.**

## Марына ЛЮБАРСКАЯ:

# «КНІГІ З КНР ВУЧАЦЬ КУЛЬТУРЫ, ПАВОДЗІНАМ, АДДАНАСЦІ І ДАВЕРУ»

**Ці далёкі ад нас Кітай? Ці далёкія мы ад Кітая? Чым цікавы народ Кітая? Хто з'яўляецца летапісцам яго гісторыі? Чые імёны робяць гэту вялікую краіну больш блізкай, больш зразумелай? Назапасіўшы з дапамогай кніг кітайскіх аўтараў разважлівасць, глыбіню, індывідуальнасць, імкнучыся да чалавекалюбства, чытач зможа адчуць кітайскі каларыт поруч з сабой. Для гэтага ў яго ёсць «Шанец». Такую назву носіць кніжнае выдавецтва, якое ўжо зарэкамендавала сябе ў розных краінах. Працуе яго філіял і ў Мінску. "Звязда" задала шэраг пытанняў Марыне ЛЮБАРСКАЙ, дырэктару мінскага падраздзялення Міжнароднай выдавецкай групы «Шанец» (ТАА «Выдавецтва «Усходняя культура»), — і ўвогуле пра гэты знакавы праект, і аб тым, якія кнігі пра Кітай, кітайскую гісторыю і культуру ўбачаць свет у Беларусі ў найбліжэйшы час.**

— Магчымасці нашых чытачоў разнастайныя. Група прадстаўлена шасцю асобнымі выдавецтвамі «Шанец» — кампаніямі, якія выдаюць кітайскую літаратуру, — расказвае Марына Любарская. — На тэрыторыі СНД працуюць прадстаўніцтвы ў Казахстане, Кыргызстане, Расіі, Беларусі, а таксама ёсць падраздзяленні ў Японіі і ў Кітаі. Гісторыя стварэння выдавецкай групы падкрэслівае любоў яе стваральніка да сваёй краіны і яго энтузіязм: самастойна ён рызыкнуў арганізаваць бізнес за межамі сваёй Радзімы. Заснавальнікам кампаніі спадаром Му Пінам рухае ідэя пазнаёміць з кітайскай літаратурай чытачоў за межамі Кітая. Першае выдавецтва было заснавана ў 2010 годзе ў Пекіне. Пасля наступіў час стварэння падраздзяленняў у Кыргызстане, Казахстане, Расіі, Беларусі і Японіі. У перспектыве чакаецца адкрыццё выдавецтваў групы «Шанец» ва Украіне і іншых краінах Еўропы. Як падкрэслівае спадар Му Пін, асноўная задача кампаніі — прасоўванне і папулярызацыя культурнай спадчыны Паднябеснай. Ужо больш за год існуе мінская структура, заснаваная ў кастрычніку 2019 года. Стварэнне і фарміраванне «Выдавецтва «Усходняя культура» і кнігарні «Шанец» супала з першай хваляй каранавіруса. І гэта, безумоўна, крыху стрымлівае многія ініцыятывы.

Супрацоўнікі «адшукваліся» ў першай палове года, калі дамінавалі невядомасць і прадчуванне небяспекі. Аднак неабходнасць наладжваць выдавецкі працэс, перакладаць, рэдагаваць, рыхтаваць кнігі да друку разам з тым адцягвала ўвагу ад пандэміі.

Кантакты з заснавальнікам — грамадзянінам КНР Му Пінам — з-за каранавіруса атрымаліся мінімальныя. Яго прыезд у Мінск па пытаннях арганізацыі нашага выдавецтва так і застаўся адзіным. Мой кароткі і таксама адзіны візіт у Маскву (там знаходзіцца галоўны офіс выдавецкай групы «Шанец») дапамог вызначыцца са стылем, характарам літаратуры і арганізацыйнымі пытаннямі. У сакавіку 2020 года заснавальнік паехаў у Токіа адкрываць новы філіял. У Японіі Му Пін з-за каранцінных абмежаванняў працуе і сёння — перамяшчацца з краіны ў краіну цяпер складана. «Электроннае ўзаемадзеянне» стала звычайнай магчымасцю для вызначэння планаў мінскага выдавецтва. Аднак складанасці толькі дадалі энергіі. З усёй адказнасцю падкрэслю, што наш унікальны калектыў сфарміраваны з высокіх прафесіяналаў сваёй справы — ён адзіны такі ў Беларусі. Разам сабраліся добрыя знаўцы, здольныя ацаніць кітайскую мову і літаратуру, эрудзіраваныя спецыялісты з выдатнай падрыхтоўкай.



***— Вы, відаць, усе гаворыце на кітайскай мове?***

— Не (*усміхаецца*). Пераклады ў нас ажыццяўляюць трое выдатных штатных кітаістаў: Марыя Булгак, Святлана Дзенісёнак і Кацярына Гардзей. З намі працуюць вопытны, лёгкі ў адносінах галоўны рэдактар Алена Таборава і два дасведчаныя рэдактары — Аляксей Багушэвіч і Сяргей Клюцкі. Мілая і працалюбівая карэктар Кацярына Казакова выдатна валодае беларускай і рускай мовамі. Дарэчы, гэта вялікае дасягненне перакладчыкаў і рэдактараў: яны працуюць над кнігамі на дзвюх мовах. Кнігі паступаюць да нас з Пекіна, і мы не размяжоўваем, на якую мову патрэбна перакласці кітайскага аўтара. Сфарміравалася два звяны: «кітайска-беларускае» і «кітайска-рускае».



***— Вы перакладаеце на беларускую мову непасрэдна, без «рускай» версіі?***

— Так. Мы ўважліва вывучаем асаблівасці беларускай мовы. Раімся з экспертамі (прафесарскім складам Нацыянальнай акадэміі навук і вядучых ВНУ Беларусі). Па цікавых і складаных выпадках перакладчыцкай дзейнасці бачым, што наспела неабходнасць унесці дапаўненні ў існуючыя моўныя нормы, у прыватнасці у Закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», каб рабіць больш дакладныя пераклады, пазбягаючы рознachытанняў.

Вернемся да складу супрацоўнікаў. Над дызайнам і вёрсткай кніг працуе сапраўдны творчы мысляр Надзея Лусцянкова. У штаце ёсць маркетолаг Вольга Шчурава — уважлівая, адказная. Яна арганізоўвае работу крамы, дзе гандлярамі працуюць абаяльныя і кантактныя Анастасія Кандакова і Маргарыта Мілінюк. Пытаннямі прэзентацыі кніг займаецца крэатыўная Анастасія Віткоўская. Сярэдні ўзрост супрацоўнікаў кампаніі — 31 год. Акрамя таго, мы пастаянна прыцягваем пазаштатных спецыялістаў. Наша выдавецтва «Шанец» дапоўнілася трэцім пазаштатным звяном — кітайска-ўкраінскім: мы займаемся перакладамі і рэдактурай, што пашырае аўдыторыю чытачоў. Я ўжо казала вышэй, што ў перспектыве — адкрыццё ўкраінскага філіяла «Шанца».

***— Наколькі цікаўныя чытачы да плёну вашай працы?***

— Кітайская культура для беларускага чытача — гэта абсалютна іншы свет: глыбокі і маладаследаваны. Асацыятыўна Кітай для нас — гэта Канфуцый, Лао-Цзы (часцей за ўсё, на вялікі жаль, як «імёны на слыху»), індустрыяльны «Вялікі камень», прыватныя кантакты праз AliExpress. Са з'яўленнем нашых перакладчыкаў і дзякуючы выдадзеным на беларускай мове кнігам Кітай становіцца прыадчыненай скарбніцай, бо гісторыя і культура гэтай краіны без перабольшання самабытныя. Уласна кажучы, гэта і падкрэслівае нашу задачу — папулярызацыю кітайскай літаратуры.

***— А якую канкрэтна літаратуру вы ўсё ж такі выдаеце? Ці ёсць пэўныя прыхільнасці да той ці іншай тэмы?***

— Літаратура розная: ад дзіцячых кніг да філасофскіх разважанняў, ад гістарычных вышукаў да мініяцюрных эсэ пра жывапіс Кітая (якія, дарэчы, у апошні час карыстаецца ўзрослай папулярнасцю — дзякуючы сваёй неардынарнай, нязвыклай стылістыцы). У Беларусі выклікаюць цікавасць не толькі пералічаныя вышэй тэмы, але і вучэбная літаратура. Мы не выдаём яе самі, а прывозім ад калег з Масквы. Паколькі супрацоўніцтва з Кітаем набірае абароты, у многіх ВНУ ёсць адпаведныя спецыяльнасці. Мы дапамагаем студэнтам вялікім наборам падручнікаў і дапаможных выданняў: прапісі, слоўнікі, дапаможнікі. Выдаём тое, што цяпер выклікае інтарэс: навукова-папулярныя кнігі — «Духоўныя асновы кітайскай культуры» Лоу Юйле, «15 лекцый па гісторыі Кітая» Джана Цзіджы. На днях выходзяць яшчэ дзве кнігі: «Кітайская эстэтыка XX стагоддзя» і «Гісторыі з вуснаў Сі Цзіньпіна». У рэалізацыі нашай літаратуры ёсць пэўныя складанасці. На жаль, з-за каранавіруса адменены многія мерапрыемствы, якія раней дапамагала арганізоўваць пасольства КНР: прэзентацыі, выстаўкі, лекцыі... Але ў нас і зараз акумулюецца вопыт, мы фарміруем чытацкую аўдыторыю. Наша кнігарня ў Мінску на Рэвалюцыйнай, 11 чуйна «ловіць» зацікаўленні чытачоў. Таму мяркуем: усё, што ні робіцца, — да лепшага. Упэўнена, што калі мы якраз асвоімся на беларускім рынку, адчыняцца і шырокафарматныя кніжныя мерапрыемствы. Дарэчы, 18—21 лютага 2021 года ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» (Мінск, праспект Пераможцаў, 14) будзе праходзіць XXVIII Мінская міжнародная выстаўка-кірмаш. Мы з'яўляемся яе ўдзельнікамі, разгортваем свой стэнд, аб'яднаны са стэндам Інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Спадзяюся, што шмат хто з гасцей, наведвальнікаў выстаўкі завітае да нас. Таксама сёння мы прапануем кнігі і ў сваёй краме, і ў крамах «Белкнігі», і ў розных інтэрнэт-крамах. Заходзьце, набывайце, у нас сапраўды ёсць што пачытаць!




***— І ўсё ж у чым асаблівасць работы вашай каманды?***

— Калі гаварыць наогул пра праект, то ўсе выдавецтвы «Шанца» працуюць па адзінай сістэме. Вывучаецца рынак, улічваюцца інтарэсы нацыянальных аўдыторый. Да асаблівасцяў адносяцца багацце тэм, кірункаў, моў, шматграннасць попыту, партнёрства і ўзаемадзеяння: пры неабходнасці нам могуць дапамагчы і масквічы, і пекінцы, і казахі, і кыргызы. Вось з японцамі мы пакуль што яшчэ не пазнаёміліся, але, спадзяюся, што з часам гэта адбудзецца. Даволі цікава назіраць, як успрымаюць кітайскага аўтара перакладчыкі аднаго і таго ж тэксту, напрыклад, на беларускую і ўкраінскую мовы. Адценні думак, ідэй аўтараў «шліфуюцца» некалькімі спецыялістамі. Такім чынам з'яўляюцца «цікавінкі» тонкага ўспрымання, а мы з задавальненнем перадаём гэтыя тонкасці нашым чытачам!

Самае цікавае ў нашай рабоце — гэта штодзённы сінтэз кітайскай і еўрапейскай выдавецкіх культур. Паколькі мы выдаём кнігі на беларускай, рускай, украінскай мовах, важна, каб яны захоўвалі бачны вобраз тысячагадовай гісторыі Кітая, неслі ў сабе культурную спадчыну краіны не толькі ў тэксце, але і ў падборы ілюстрацый, дызайне, шрыфтах. Патрэбна знайсці тонкі баланс паміж выразнай інфарматыўнасцю і ўражальнай нагляднасцю макета ўвогуле.

Прыемна, што кнігі, якія мы выдалі на беларускай мове, паўтаруся, перакладзены непасрэдна з кітайскай, мінаючы рускую мову. Перакладчыкі «Усходняй культуры» дэманструюць не толькі выдатнае валоданне кітайскай мовай, але і глыбокія веды ў філасофіі, гісторыі, культуры, фальклоры, побыце Кітая і многім іншым. Задача наступнага звяна — рэдактараў выдавецтва — не проста выверыць правільнасць і дакладнасць тэксту, але і данесці да чытачоў закладзены кітайскім аўтарам сэнс, перадаць яго настрой і стаўленне да выкладзенага ў кнізе, а галоўнае — не страціць «кітайскі дух» аповеда.

Мы спрабуем наладзіць работу так, каб да кніг і падручнікаў, да асаблівасцяў кітайскай гісторыі ў беларускіх чытачоў сфарміравалася шчырая і натуральная зацікаўленасць. Імкнёмся зрабіць гібкім і зручным працэс рэалізацыі літаратуры. Спадзяёмся, што зможам убачыцца з чытачом на многіх імпрэзах, прэзентацыях, выстаўках у 2021 годзе. Гэта дазволіць адчуць глыбіню і перспектывы супрацоўніцтва народаў нашых краін — Беларусі і Кітая!

Свой погляд

# СТАЦЬ НАСТАЎНІКАМ ПРОСТА, А ВОСЬ БЫЦЬ ІМ...

**Прафесія педагога заўсёды лічылася адной з самых паважаных.**

**А зрэшты, чаму гэта лічы*лася*? Такой — на мой погляд — яна застаецца і сёння.**

**Аб гэтым я ведаю не па чутках: сам амаль 20 гадоў працую настаўнікам пачатковых класаў, маю вышэйшую адукацыю і катэгорыю, пастаянна кантактую з дзецьмі, асобныя з якіх у дарослым жыцці таксама хацелі б стаць педагогамі.**



Вось тут ёсць адзін цікавы момант: стаць (тым жа настаўнікам) і быць ім — гэта, мякка кажучы, зусім не адно і тое ж. Ну сапраўды: юнак альбо дзяўчына скончылі школу, набралі пэўную колькасць балаў на ЦТ у педагагічны ўніверсітэт ці каледж, адвучыліся там і як быццам усё — могуць ісці ў школу, выкладаць пэўныя прадметы. Аднак многія з маіх знаёмых, атрымаўшы дыпломы, альбо не захацелі, альбо не змаглі працаваць па спецыяльнасці.

Не буду зараз пісаць, чаму: у кожнага свае прычыны і довады...

На мой погляд, у тых, хто выбірае для сябе прафесію настаўніка, павінны быць, па-першае, шчырыя любоў і павага да дзяцей з усімі іх вартасцямі і заганамі (няшчырасць, як той казаў, тут не пракоціць, бо дзеці вельмі тонка ўсё адчуваюць), па-другое — жаданне і ўменне перадаваць свае веды...

Нерытарычнае пытанне: што атрымліваць узамен?

Для мяне і найперш — гэта велізарны аб'ём станоўчых эмоцый, бо, аддаючы дзецям сваю любоў, у адказ атрымліваеш іхнюю. Да таго ж зносіны з падрастаючым пакаленнем — гэта крыніца маладосці і аптымізму, гэта пастаянны пошук і магчымасць праявіць свае творчыя здольнасці... Гэта, урэшце, не столькі праца, колькі лад жыцця.

> **«Прафесію настаўніка (ды яшчэ пачатковых класаў) асобныя лічаць выключна жаночай. Амаль 20 гадоў я стараюся разбурыць гэты стэрэатып, даказаць, што мужчына ў школе — гэта нармальна, а ў малодшых класах, дык, магчыма, і досыць добра...»**

Прафесію настаўніка (ды яшчэ пачатковых класаў) асобныя лічаць выключна жаночай. Амаль 20 гадоў я стараюся разбурыць гэты стэрэатып, даказаць, што мужчына ў школе — гэта нармальна, а ў малодшых класах, дык, магчыма, і досыць добра...

Тут жа паўстае заканамернае пытанне пра заробак, працягласць адпачынку...

Для мяне гэта не самыя галоўныя крытэрыі (галоўнае, па-мойму, любіць сваю справу, інакш яна ніколі не будзе прыносіць задавальнення), але ж...

Адпачынак у настаўніка — 55—60 каляндарных дзён (гэта — у залежнасці ад кантракта). З заробкамі трохі складаней, бо яны залежаць ад нагрузкі (колькасці гадзін у тыдзень), ад катэгорыі, прэміі, матэрыяльнай дапамогі, стажу работы... Так што настаўнік ніколі не зможа дакладна адказаць на пытанне, якая ў яго зарплата. Я звычайна кажу, што яна прыстойная, вядома ж, пры старанні і наяўнасці высокіх паказчыкаў. Мне, напрыклад, даводзілася браць удзел у раённым конкурсе «Настаўнік года», праводзіць адкрытыя ўрокі і мерапрыемствы для маладых калег...

Помню, адна з маіх вучаніц усе школьныя гады марыла стаць настаўніцай беларускай мовы. Аднак, атрымаўшы атэстат, разгубілася і ледзь не спасавала. Ва ўсякім разе пры сустрэчы сказала мне, што гэтая праца ўсё ж вельмі адказная, што яна не з лёгкіх, дык можа і сапраўды, спытала, выбраць нешта прасцейшае?

Я тады адказаў, што такія прафесіі, напэўна ж, ёсць, што іх, магчыма, нават многа: няцяжка выбраць і атрымаць. Аднак людзям творчым ці нават амбіцыйным у іх нецікава і вельмі цесна. Гэты шлях не для іх.

Як даведаўся праз нейкі час, я тады размаўляў са... сваёй будучай каляжанкай, цудоўным педагогам, якога вельмі любяць дзеці.

**Анатоль АСКІРКА,**
*г. Быхаў.*

• **У тэму**

# Мы малявалі дарогу праз лес...

**Даўно гэта было, але ж помніцца.**

**У нас урок малявання. У клас заходзіць настаўніца, кладзе на стол вялікі ружовы яблык і кажа, што яго трэба... маляваць.**

Толькі што скончылася вайна. У чэргах па хлеб людзі стаялі з чатырох гадзін раніцы. У школе не было ніякіх сталовых-буфетаў.

Але быў яблык! Сапраўдны... Ну ці ж не цуд!.. Дык навошта яго маляваць? Лепей з'есці! Хай па маленькім скрылічку, але хутчэй!

Ва ўсе вочы я глядзела на той яблык і глытала слінкі — маляваць не магла. Я атрымала двойку і разлюбіла настаўніцу. Назусім.

Гэта было ў чацвёртым класе, а ў пятым да нас прыйшоў новы настаўнік малявання Іван Мацвеевіч. Ён быў даўгавязы, нешматслоўны і для пачатку папрасіў, каб мы намалявалі... што-небудзь, што ўмеем.

Мы, высунуўшы языкі, увесь урок стараліся, Іван Мацвеевіч назіраў, нешта некаму тлумачыў. А на наступным уроку падышоў да дошкі і сказаў: «Так, сябры мае, сёння я пакажу вам, як маляваць карціну. Яна будзе называцца «Дарога ў лес».

Пасля гэтага Іван Мацвеевіч падышоў да дошкі і на ёй стаў крэйдай ставіць кропкі, потым злучаць іх.

Мы рабілі тое ж самае, толькі алоўкамі на сваіх лістах паперы і бачылі, як з'яўляецца цуд: дарога, якая ідзе ў лес. (Лапкі дрэў, што стаялі паабапал, мы дамалёўвалі потым: настаўнік тлумачыў, як гэта трэба рабіць.)

У канцы ўрока Іван Мацвеевіч папрасіў нас падняць малюнкі і паказаць яму. Затым сабраў работы і большасці вучняў паставіў «выдатна».

А яшчэ ён сказаў: «Сябры мае, толькі што вы намалявалі дарогу, кожны — сваю. Чаму праз лес? Таму што ён — гэта перашкоды, якія непазбежна будуць. Але ж помніце: смелыя і моцныя з лесу выходзяць заўсёды. Трэба толькі ісці, як бы цяжка вам ні было.»

Гэтыя словы я помню ўсё жыццё. Крылатае «Дорогу осилит идущий» прыйшло нашмат пазней...

**Зоя НАВАЕНКА,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

Гэта мы...

# Зямлячка Гандзя

**...Гэту невысокую, па-мужчынску шыракаватую ў плячах жанчыну я ніколі не бачыў у нечым святочным. Магчыма, таму што свят — ці проста выхадных — у яе не было: Гандзя адна працавала на цялятніку: паіла, карміла, падсцілала малых бычкоў ды цялушачак, касіла для іх маладзенькую траўку, збірала зёлкі, лячыла...**

Там жа, у кутку цялятніка, яна трымала сваю карову, а сама жыла ў былым панскім бараку, які чамусьці называлі чвараком. Кватэру ёй далі пазней, калі і іншым спецыялістам саўгаса, у новым 12-кватэрным доме. Але на абед туды Гандзя не хадзіла, шкадавала часу: абыходзілася хлебам з малаком...

Мы жылі паблізу і, купіўшы новы халадзільнік, помню, думалі, куды б гэта дзець стары? Прапанавалі Гандзі — задарма. І адразу ж удвух з суседам прынеслі яго ў кватэру, уключылі.

— Божачкі, а чым жа аддзячыць? — забедавала жанчына і тут жа «здагадалася». — О-о! У мяне ж карова ёсць. Лішкі малака я не здаю — выліваю цяляткам. Дык цяпер буду прыносіць вам. Свежанькае, тлусценькае...

З той пары і пачалося: на табурэце каля дзвярэй праз дзень стаў з'яўляцца трохлітровік малака. Поўны слоік я забіраў, пакідаў пусты.

Такім чынам два гады мы пілі і елі свежае малако, збіралі смятану, рабілі тварог. Грошы з нас Гандзя не брала — хіба нешта з адзення...

Потым мы перабраліся ў горад і бачыцца з ёй перасталі. Аднак у памяці яна і да сёння — зямлячка Гандзя, цудоўны просты чалавек.

**І. ПЯШКО,**
*г. Шчучын.*

Чалавек — чалавеку

# Затое ў нас з'явіўся яшчэ адзін «трактар»

**...Калі вы збіраецеся завесці катка, то намер ваш добры, гуманны і, магчыма, нават выгадны, бо ў сельскай мясцовасці ці ўласным доме ў горадзе для гадаванца знойдзецца справа — паляваць на мышэй. Але ж гэта потым...**

Першае, што вам прыйдзецца зрабіць, — паказаць малому месца, дзе павінен стаяць латок з напаўняльнікам, і загадзя змірыцца з тым, што гадаванец будзе памыляцца. Яго памылкі будуць проста лезці ў вочы і побач з латком (што добра яшчэ), і паводдаль: напрыклад, на вашым любімым крэсле ці ложку.

Наступная задача — вызначыць месца для сну і адпачынку... Хоць зноў жа не факт, што сярод ночы, засумаваўшы, навасёлец не будзе прыходзіць да вас са сваімі пяшчотамі-пацалункамі.

Узнікне і праблема з мыццём, бо ў поўсці вашага катка можа аказацца шмат маленькіх чорненькіх «насельнікаў», якіх прыйдзецца «вымываць» спецыяльным шампунем. Вашаму гадаванцу гэта, вядома ж, не спадабаецца. Ён будзе нема раўці і драпаць вас усімі сваімі кіпцюрамі...

Паразіты могуць жыць і ў страўніку вашага катка...

Вы справіліся — адолелі гэтыя цяжкасці? Ваш малы расце, набіраецца моцы і ўжо спрабуе ўчапіцца ў калашыну і па ёй залезці на спіну?

Тады ведайце, што не менш спрытна ён можа сiгануць *на* шафу, *у* шафу ці *пад* яе, «навесці парадак» на ўсіх адкрытых паліцах і нават у... хлебніцы, якую вы забыліся закрыць. А яшчэ — матнуцца на карніз, «пагуляць-пагушкацца» на гардзінах. Яны, канапа ды ножкі стала, каб вастрыць кіпцюры — вось тыя месцы, дзе каток адыграецца напоўніцу...

Куды не залезе? У нашага — з недасяжных (ва ўсякім разе, пакуль) засталіся толькі столь і люстра. Усё астатняе, здаецца, не перашкода.

І таму зачыняючы дзверы, будзьце ўважлівыя, каб не прышчаміць гадаванца, які не паспеў праскочыць за вамі, бойцеся пакінуць яго ў кладоўцы ці недзе яшчэ, каб потым не шукаць.

...Гэта, вядома ж, далёка не ўсе складанасці ўтрымання жывёліны. Будуць іншыя — ветэрынарныя, псіхалагічныя, эстэтычныя. Вы гатовы іх вытрымаць? Падумайце, узважце.

Мы з жонкай гэта зрабілі, праз многае прайшлі, і цяпер у нас з'явіўся яшчэ адзін «трактар». Слухаем, як соладка ды ўдзячна гэты басяк муркоча, і ўжо, здаецца, не помнім, пра цяжкасці яго выхавання.

**Аляксандр МАТОШКА,**
*Расонскі раён.*

Век жыві...

# Следам за дзедам

Сёння дзеці снедаюць не адны, а разам з дзядулем. Есці, відавочна, яшчэ не хочуць: круцяць насамі, як той казаў, выбіраюць нешта смачнейшае.

— Так... А чаму гэта вараныя яйкі па талерцы качаюцца? — строга пытае дзед.

— Бо яны круглыя, — разумна зазначае самы малы.

— А давайце мы іх паставім — носікамі ўверх...

— Як гэта? Яны ж пакоцяцца, — не разумеюць дзеці.

— А вось так, — кажа дзед, бярэ яйка, тупым канцом ставіць на сваю талерку і злёгку націскае.

Хлопцам даспадобы гэты фокус. Яго тут жа пачынаюць паўтараць.

— А зараз солькай пасыпалі — і ў рот, — камандуе дзядуля.

Весела з ім снедаць.

**Вольга ФЕДЗЯШЫНА,** *г. Слуцк.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Моцныя думкі

# Мацвей ВОЛКАЎ: «Я ЛЮБЛЮ, КАЛІ КІПЯЦЬ СТРАСЦІ»

**Спартсмены — людзі моцныя не толькі целам, але і духам. Спорт вучыць думаць на тры крокі наперад, аналізаваць сітуацыю і прымаць правільныя рашэнні. У атлетаў ёсць чаму павучыцца. У рубрыцы «Моцныя думкі» мы прапануем даведацца, аб чым думаюць спартсмены.**

**Мацвей Волкаў — спартсмен-сенсацыя, і не толькі таму, што ён сын вядомага савецкага скакуна з шастом Канстанціна Волкава. У 16 гадоў Мацвей ужо паспеў пабіць сусветны юнацкі рэкорд, узляцеўшы на 5,50 метра. Спыняцца на гэтым ён не збіраецца, у яго ёсць справа спартыўнага гонару. Хлопец кінуў выклік рэкардсмену свету Арманду Дзюпланцісу, які ў 2020 годзе перапісаў 26-гадовы рэкорд Сяргея Бубкі (6,14 метра), скокнуўшы 6,18. З 2020 года Мацвей Волкаў выступае за Беларусь. Для беларускай лёгкай атлетыкі яго пераход — падзея гістарычная. Не даведацца аб «моцных думках» спартыўнага вундэркінда было б недаравальна.**



## «Лячу і думаю: упадзе ці не»

**Рэкорды і мэты.** Адной з сваіх мэт я ўжо дасягнуў: пабіў сусветны рэкорд, скокнуўшы 5,50 метра. Маёй мэтай было ўстанавіць сусветны рэкорд сярод юнакоў да 18 гадоў — 5,58 метра. Я яе дасягнуў, скокнуўшы на 5,60.

**Ліміт.** Мне здаецца, скачкі з шастом — адзіная дысцыпліна лёгкай атлетыкі, дзе няма мяжы. Напрыклад, у спрынце наўрад ці камусьці ўдасца пабіць рэкорд Усэйна Болта, таму што гэта ўнікальны чалавек, другога спартсмена з такімі жа данымі ў свеце проста няма. Ніхто не зможа пераўзысці яго выгікі. А ў скачках з шастом не столькі важныя ўнікальныя асаблівасці арганізма, колькі валоданне тэхнікай і адчуванне ўласнага цела.

**Падзенні.** Мабыць, скакуны з шастом, як ніхто іншы, ведаюць, што значыць узлятаць і падаць. Ляцець з пяціметровай вышыні зусім не страшна, я нават не заўважаю гэтага палёту. Праўда, бывае не па сабе, калі падчас скачка я чапляю перакладзіну. У такія моманты лячу і думаю: упадзе яна на мяне ці не.

**«Іркуцкі Бубка».** Часам у прэсе мяне называюць «Іркуцкім Бубкам», нічога супраць гэтага не маю. Мабыць, нядрэнна, калі тваё імя ставяць побач з імем такога легендарнага спартсмена. А вось калі мяне параўноўваюць з Дзюпланцісам, то пачынаю злавацца. Ён жа такі спартсмен, як я, толькі крыху старэйшы, ён не зрабіў нічога выдатнага. І, дарэчы, я ўжо пераскочыў вынік, які ён паказваў у маім узросце.

**Заклятыя сапернік.** Мне цікава спаборнічаць, калі ёсць барацьба, шоу. Зараз для мяне галоўная мэта — перамагчы Дзюпланціса. Як толькі гэта адбудзецца, я змагу сказаць, што я дасягнуў сваёй мэты, і, як бы нясцiпла гэта ні гучала, стану найлепшым скакуном. У мяне нават быў пост у «Інстаграме», дзе я паабяцаў, што за тры гады даганю Дзюпланціса. Засталося ўжо два гады. Зараз ён скача 6,18 метра, будзе яшчэ вышэй, так што мне прыйдзецца папрацаваць, каб не толькі яго дагнаць, але і перагнаць. Але я не баюся, ведаю, што змагу. Я часта чапляю яго ў сацыяльных сетках, канешне, ён гэта заўважае. Нядаўна напісаў яму, што ў 2021 годзе ўсе медалі будуць мае. Разумею, што пакуль гэта немагчыма, але захацелася яго зачапіць. А Арманд — малайчына, пасміяўся, нармальна адрэагаваў. Калі б нешта падобнае наконт мяне напісалі, я раззлаваўся б. Мне здаецца, такія бяскрыўдныя правакацыі ў сацыяльных сетках падаграваюць інтарэс да нашага віду спорту. Дарэчы, хэштэг



*#дайтемнетригода* стаў папулярны ў інтэрнэце, асабліва ў суполках для лёгкаатлетаў.

**Знакавыя спаборніцтвы.** Вырашальным стаў турнір, дзе я скокнуў 3,90 метра. Праўда, я не памятаю, якія менавіта гэта былі спаборніцтвы, але ўжо і няважна. Да таго я скакаў 3,30, і літаральна за год вынік вырас на 60 сантыметраў. Мне было 13 гадоў, сусветны рэкорд у гэтай узроставай катэгорыі 3,97 (дарэчы, рэкорд Дзюпланціса). Тады да трэніровак я ставіўся не надта адказна. Але пасля гэтага выступлення зразумеў, што калі буду працаваць сур'ёзна, буду скакаць яшчэ вышэй. Ніколі не забуду першы смак перамогі.

**Алімпійскія гульні.** Зараз у мяне яшчэ ёсць час адабрацца на Алімпійскія гульні ў Токіа. Для гэтага патрэбна скокнуць 5,80, і, шчыра кажучы, я на гэта здольны. Калі ўсё будзе добра, паеду на Алімпіяду ўжо гэтым летам. Калі нешта пойдзе не так, то мая першая Алімпіяда будзе ў 2024-м у Парыжы.

## «Параўноўваць мяне з татам — нелагічна»

**Выбар.** На першы погляд можа здацца, што ў мяне не было выбару, якім спортам займацца: дзед, бацька скакалі з шастом, лагічна, што трэба працягваць дынастыю. Але на самай справе мяне ніхто не прымушаў. Я сам захацеў паспрабаваць і папрасіў тату мяне навучыць. Так і ўцягнуўся. Напэўна, я мог бы займацца і чымсьці іншым, але дасягнуць поспеху ў мяне атрымаецца толькі ў скачках з шастом. У мяне для гэтага ёсць усё неабходнае — генетыка, высакакласны трэнер і імкненне.

**Параўнанне з бацькам.** Я не баюся, што мяне могуць параўноўваць з татам. У 24 гады, стаўшы ўжо дарослым і вопытным спартсменам, ён скакаў усяго на 35 сантыметраў вышэй за мяне цяперашняга. Мне пакуль толькі 16, і за восем гадоў я спакойна набяру гэтыя 35 сантыметраў. У мяне яшчэ растуць сіла, хуткасць і, адпаведна, вынік. Увогуле, у нас з татам абсалютна па-рознаму складваецца кар'ера, цяпер іншы час, таму параўноўваць нас мне здаецца нелагічным.

**Тата-трэнер.** Мой асабісты трэнер — мой тата. І мне гэта вельмі падабаецца. Па-першае, ніхто так не будзе падтрымліваць і перажываць, як самы родны чалавек. Па-другое, мы разам 24 гадзіны ў суткі, сем дзён на тыдзень. Я заўсёды магу з ім абмеркаваць свае памылкі, недахопы, магу параіцца, калі нешта турбуе. Хоць дома рабочыя моманты абмяркоўваем рэдка. Гэта вялікі козыр перад маімі сапернікамі. Як паказвае практыка, у нашым спорце поспехаў дасягаюць дуэты бацькі і сына. Напрыклад, Арманда Дзюпланціса таксама трэніруе яго бацька.

> **«У мяне нават быў пост у «Інстаграме», дзе я паабяцаў, што за тры гады даганю Дзюпланціса. Засталося ўжо два гады».**

**Мама-псіхолаг.** Мая мама — псіхолаг па прафесіі і яна многае робіць для маёй псіхалагічнай падрыхтоўкі, што таксама вельмі важна для спартсмена. Дзякуючы маме і яе выхаванню я ўмею правільна настройвацца перад выступленнем. На трэніроўках я часам дазваляю сабе расслабіцца, заленавацца, штосьці не рабіць. Канешне, гэта ўплывае на якасць маіх трэніровачных скачкоў. Але на спаборніцтвах, перад выхадам у сектар я збіраю ўсе сілы ў кулак, канцэнтруюся, наколькі гэта магчыма, і раблю ўсё на 110 %.

## «Выступаць пад нейтральным сцягам для мяне непрымальна»

**Змена грамадзянства.** Праз праблемы ва Усерасійскай федэрацыі лёгкай атлетыкі, шматлікія допінгавыя скандалы будаваць спартыўную кар'еру ў Расіі вельмі складана. Выступаць пад нейтральным сцягам, як усе расійскія спартсмены, для нас было непрымальна. Мы вырашылі, што не можам рызыкаваць маёй кар'ерай, патрэбна змяняць спартыўнае грамадзянства. Так з 2020 года я выступаю за Беларусь і абсалютна аб гэтым не шкадую. У мяне цудоўныя адносіны з Беларускай федэрацыяй лёгкай атлетыкі. Былы старшыня Вадзім Дзевятоўскі цёпла нас прыняў, а з новым старшынёй Іванам Ціханам я пакуль не паспеў пазнаёміцца. Мне імпануе адкрытасць беларускай федэрацыі. Я магу напісаць генеральнаму сакратару Вераніцы Грэсь і папрасіць, каб на маім выступленні была пэўная музыка, і мая просьба будзе выканана. У Расіі такога няма, кіраўнік федэрацыі — дзяржаўны служачы, і звяртацца да яго па такіх пытаннях нельга.

**Пераезд у Беларусь.** Мы пераехалі ў Беларусь усёй сям'ёй назаўсёды і аб вяртанні ў Іркуцк нават не думаем. Бацькі знайшлі работу ў Мінску, мяне ўладкавалі ў школу. Я да пераезду не так шмат ведаў пра Беларусь. Ведаў рэпера Макса Каржа і тое, што тут любяць бульбу. Мінск мне спадабаўся, прыгожы горад, асабліва ў цэнтры. І дранікі мне прыйшліся даспадобы. А больш за ўсё мне падабаецца ў Беларусі надвор'е, яно тут больш мяккае, чым у нас.

**Новая школа.** Я вучуся ў вучылішчы алімпійскага рэзерву і мне зручна сумяшчаць вучобу і спорт. У Расіі я вучыўся ў звычайным ліцэі і быў троечнікам, а цяпер маю адзнакі сем-восем, што, мне здаецца, нядрэнна. Спачатку было цяжка перайсці з пяцібальнай сістэмы на дзесяцібальную.

**Будучая прафесія.** Лічыцца, што спартсмен павінен паступаць ва ўніверсітэт фізкультуры. А я не хачу. Мне падабаюцца хімія і біялогія, таму, хутчэй за ўсё, буду паступаць у БДУ ці БНТУ на спецыяльнасць, звязаную з біялогіяй.

**Дзіцячыя мары.** У дзяцінстве я вельмі хацеў стаць нейрахірургам, бо па мамінай лініі ўсе сваякі — урачы. Але я разумею, што нейрахірургія — вельмі складаная і адказная дзейнасць, бо на кон пастаўлена жыццё чалавека. І патрэбна пастаянна вучыцца. Аб якой спартыўнай кар'еры ў такім выпадку можа ісці гаворка? І я зрабіў выбар на карысць спорту.

## «Гледачы не любяць шэрых мышак»

**Жаданне быць навідавоку.** У мяне такі характар, што мне падабаецца вылучацца. Я люблю, калі кіпяць страсці. Гэта падаграе інтарэс публікі. Гледачы не любяць «шэрых мышак», якія трэніруюцца і скачуць, гэта сумна і нецікава. Я хачу, каб людзі, якія глядзяць маё выступленне, адчувалі азарт, пазітыў. Без гэтага спорт ператвараецца ў руціну.

**Азарт ва ўсім.** Я не іграю ў азартныя гульні, гэта абсалютна не маё. Але ў спрэчцы я азартны, я заўсёды настойваю на сваім, нават калі не маю рацыі. Калі я ў чымсьці ўпэўнены, то пераканаць мяне немагчыма. Памятаю,



дома быў гадзіннік, дзе секундная стрэлка была замацавана на празрыстым крузе. Я са слязамі на вачах даказваў маме, што няма ніякага круга і гэта простая празрыстая стрэлка. Тую спрэчку я прайграў і больш ніколі з мамай не спрачаўся.

**Рэп.** Нядаўна я сам пачаў пісаць і чытаць рэп. Мне з дзяцінства падабаецца гэта музыка. Я сам пішу тэкст, гэта вельмі цікавы працэс. Часам словы самі ўсплываюць у галаве, рыфмуюцца і паступова атрымліваецца цэлы тэкст. Галоўнае — адчуваць матыў і біт, каб атрымаўся класны трэк. Музыку я пакуль сам не ствараю, мне ў гэтым дапамагаюць прафесіяналы на студыі гуказапісу. Пакуль шмат часу рэпу не ўдзяляю, бо трэба быць сканцэнтраваным на спорце.

**Лянота.** Нягледзячы на тое, што я вельмі мэтанакіраваны і ўпарты, я крыху гультай. Як я ўжо казаў, магу расслабіцца на трэніроўцы, не заўсёды раблю дамашняе заданне ў школе. Але я не бачу ў гэтым вялікай праблемы — часам патрэбна дазволіць сабе паленавацца, арганізму патрэбны перадышкі. Галоўнае, не перастарацца.

**Прыклады.** Не ўпэўнены, што ёсць людзі, якіх я магу назваць кумірамі. Мяне натхняе Усэйн Болт — чалавек, які дасягнуў вялікіх вынікаў. Я гляджу на яго і стараюся дасягнуць таго ж, што і ён. Хацелася б з ім пазнаёміцца.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

За штурвалам

# САКРЭТ ТАРПЕДАНОСЦАЎ

## Агучана версія знікнення самалётаў у Бермудскім трохвугольніку

**Аўстралійскі эксперт Шэйн Сатэрлі назваў магчымую прычыну знікнення пяці самалётаў і іх экіпажаў у гэтым месцы, якое адбылося 75 гадоў таму. Пра гэта паведаміў партал Nine.com.au.**



У снежні 1945 года пяць тарпеданосцаў ВМС ЗША вылецелі з Фларыды на вучэбнае заданне ў складзе звяна пад камандаваннем лейтэнанта Чарльза Тэйлара. Усяго ў экіпаж уваходзіла 14 чалавек, большасць з іх былі стажорамі.

Самалёты зніклі пасля ўваходу ў Бермудскі трохвугольнік — акваторыю плошчай да чатырох мільёнаў квадратных метраў. Ён знаходзіцца паміж паўднёва-ўсходнім узбярэжжам ЗША, Бермудскімі астравамі і Пуэрта-Рыка. Выратавальны самалёт, які адправіўся на пошукі, таксама знік. На яго борце знаходзіліся 13 чалавек.

«Некаторыя людзі давалі незвычайныя тлумачэнні, сцвярджаючы, што адбываецца нешта паранармальнае або звышнатуральнае. Тэйлар таксама не раз губляўся падчас палётаў. Яму двойчы даводзілася ратавацца ў Ціхім акіяне. Расследаванне паказала, што, калі сцямнела і надвор'е змянілася, Тэйлар накіраваў самалёты не ў тое месца», — заявіў Сатэрлі.

Ён дадаў, што самалёты патанулі, зрабіўшы пасадку на воднай паверхні, менш чым за хвіліну. У такіх выпадках не заўсёды атрымліваецца знайсці фрагменты паветраных судоў. Гэтым, на яго думку, і тлумачыцца зніклае.

«Большасць пілотаў, якія ўдзельнічалі ў інцыдэнце, былі стажорамі. Гэта азначае, што яны не былі належным чынам навучаны, як выкарыстоўваць усе прыборы самалёта пры палёце ноччу або ў дрэнное надвор'е», — паясніў эксперт.

Ён таксама падкрэсліў, што колькасць зніклых суднаў і самалётаў у Бермудскім трохвугольніку не нашмат большая, чым у любой іншай частцы акіяна.

«Калі 1000 самалётаў праляціць праз Бермудскі трохвугольнік, і мы зможам растлумачыць, што здарылася з 990 з іх, ці павінны мы сказаць, што астатнія 10 былі звышнатуральнымі выпадкамі? Я так не думаю», — падсумаваў Сатэрлі.

Пласты гісторыі

# МАГІЛА ВАЯРА-ГІГАНТА

## Археолагі раскапалі старажытнае скіфскае пахаванне

**Дзесяцігоддзе таму на гэтым месцы ўжо знаходзілі цікавыя пахаванні і ахвярнікі, у якіх выявілі прадметы побыту, антычны посуд, упрыгажэнні і нават бронзавае люстэрка скіфскіх прыгажунь. Цяпер жа археалагічная экспедыцыя Нацыянальнага запаведніка «Хорціца» выявіла на тэрыторыі вострава ўнікальную магілу скіфскага ваяра, узрост якой складае каля 2500 гадоў.**



Як адзначаецца на сайце запаведніка, пахаванне было зроблена ў земляной катакомбе глыбінёй каля трох метраў. «Нашы продкі прыклалі вялікія намаганні, каб абараніць магілу ад рабаўнікоў, таму што ўваход у катакомбу быў закладзены вялікай колькасцю цяжкіх гранітных валуноў», — гаворыцца ў паведамленні.

Пахаваны воін па старажытных мерках быў гігантам — яго рост дасягае каля 1,8 метра. У пахаванні археолагі знайшлі жалезны нож з касцяной рукаяткай, рэшткі калчана з бронзавымі стрэламі і ахвярную ежу. «Цікавым з'яўляецца тое, што над гэтым пахаваннем у старажытнасці нашымі продкамі быў зроблены кромлех — круг з гранітных камянёў — сімвал сонца, які вядомы ў культурах многіх старажытных народаў», — адзначылі ў запаведніку.

На думку навукоўцаў, падобныя знаходкі на Хорціцы сведчаць аб тым, што востраў быў важным для скіфаў месцам, дзе размяшчалася гарадзішча, міма якога праходзілі пераправы, і месца гандлю з грэчаскімі купцамі.

Начная фея

# ГАДЗІНЫ ДАЎГАЛЕЦЦЯ

## Навукоўцы назвалі працягласць здаровага сну

**У людзей, якія захоўваюць яго здаровы рэжым, рызыка сардэчных захворванняў значна ніжэйшая, чым у тых, хто спіць мала. Пра гэта паведаміла выданне Express са спасылкай на даследаванне навукоўцаў з Тулейнскага ўніверсітэта ў Новым Арлеане, ЗША.**



Спецыялісты лічаць, што сон ад сямі да васьмі гадзін штодня дапаможа зберагчы чалавека ад сардэчнай недастатковасці.

Падчас эксперыменту даследчыкі назіралі за 408 802 людзьмі ва ўзросце ад 37 да 73 гадоў, у 5221 з іх была дыягнаставана сардэчная недастатковасць. Ва ўсіх удзельнікаў з такім дыягназам адзначаліся праблемы са сном: адны пакутавалі ад бяссонніцы, іншыя часта прачыналіся па начах з-за ўласнага храпу, у трэціх працягласць сну была занадта кароткай.

Здароўе на талерцы

# АЛІЎКІ СУПРАЦЬ АЛЬЦГЕЙМЕРА

## Гэты прадукт засцерагае ад хваробы



**Істотнага паляпшэння кагнітыўных функцый можна дамагчыся, штодня ўжываючы аліўкавы алей. Пра гэта заявілі навукоўцы з Універсітэта Арыстоцеля ў Салоніках і Грэчаскай асацыяцыі хваробы Альцгеймера і звязаных з ёй расстройстваў, іх матэрыял апублікаваў Journal of Alzheimer's Disease.**

Даследчыкі на працягу года сачылі за трыма групамі людзей, параўноўвалі рацыён іх харчавання. Першая група харчавалася, прытрымліваючыся здаровай міжземнаморскай дыеты. Другая пастаянна ўжывала аліўкавы алей ад першага адцiскання (50 мл у дзень). Трэцяя група атрымлівала аліўкавы алей з умераным утрыманнем поліфенолаў (50 мл у дзень).

У выніку даследавання было ўстаноўлена, што ў людзей з дзвюх апошніх груп, у якіх у рацыён быў уключаны аліўкавы алей, назіралася паляпшэнне маркераў Альцгеймера. Ва ўдзельнікаў даследавання з першай групы паказчыкі засталіся на ранейшым узроўні або пагоршыліся.

Пасля правядзення даследавання навукоўцы зрабілі высновы пра тое, што аліўкавы алей з высокім утрыманнем поліфенолаў здольны стаць тэрапеўтычным сродкам для пажылых людзей з лёгкімі кагнітыўнымі парушэннямі, якія з'яўляюцца папярэдняй стадыяй хваробы Альцгеймера.

Меры засцярогі

# ЭКСПЕДЫЦЫІ НАВЕДВАННЯ

## Вучоны РАН ацаніў бяспечнасць палётаў на Месяц

***Яны будуць бяспечныя для людзей пры працягласці каля двух тыдняў. Пра гэта распавёў дырэктар Інстытута касмічных даследаванняў Расійскай акадэміі навук (РАН) Анатоль Петруковіч.***

Паводле яго слоў, для бяспекі чалавека патрабуецца адсутнасць буйной успышкі на Сонцы. «І ў найбліжэйшай месяцавай праграме гаворка ідзе, як правіла, пра экспедыцыі наведвання: прыляцеў, эксперыменты правёў, абсталяванне адрамантаваў і назад», — цытуе яго «РІА Навіны».

Як нагадаў Петруковіч, як толькі чалавек пакідае межы аховы магнітнага поля Зямлі, расце ступень шкоды, атрыманай ад сонечных касмічных прамянёў падчас успышак і галактычнага касмічнага выпраменьвання.



«Сонечную ўспышку можна дзесьці перачакаць, у больш абароненым адсеку. Паток галактычных прамянёў слабейшы, але ад яго не схаваешся, яны «прашываюць» наскрозь, а пры наяўнасці больш тоўстых сценак яшчэ і дадаткова генерыруюць больш небяспечнае другаснае выпраменьванне», — сказаў эксперт.

**Сяргей СТАРЫНАЎ. Фота з адкрытых крыніц.**






# КУТОЧАК БЕЛАРУСІ

Так называецца песня, створаная творчым сямейным тандэмам Яўгенам Алейнікам і Юліяй Быкавай. Так называецца і нотна-спеўны альбом, у які ўвайшлі песні Яўгена і Юліі, прысвечаныя Году малой радзімы. Альбом упрыгожаны каляровымі ілюстрацыямі, якія настройваюць чытача-гледача на адпаведны лірыка-рамантычны настрой. Да гонару ў гэтым альбоме змешчаны і мае фотаздымкі — да вядомых песень, якія часта гучаць па радыё і на канцэртах: «Вытокі», «Дарогі беларускія», «Не забывай», «Сапраўдны беларус», «Калі ты вяртаешся дадому», «Матуля». У альбоме пазначаны і выканаўцы песень, мне выпала быць у адной кампаніі з Анатолем Ярмоленкам і Алёнай Ланской, Юліяй Быкавай з гуртом «Аўра» і Аляксандрам Саладухам, Інай Афанасьевай, Іскуі Абалян і Вікторыяй Алешкай.

Сваё выданне кампазітар Яўген Алейнік і спявачка і паэт Юлія Быкава планавалі даўно. Незвычайнасць у тым, што ў альбоме ў адмысловай кішэні ёсць і CD-дыск, і флэшка з фанаграмамі, песнямі на MP3, відэа. Таму можна не толькі гартаць старонкі, чытаць словы і ноты, але адразу слухаць і глядзець артыстаў. Як той казаў: тры ў адным. Літаральна ўчора я атрымаў экзэмпляр ад аўтараў (вядома, з аўтографам) і вырашыў нагадаць нашаму чытачу пра запаведны — спеўны куточак Беларусі. Думаю, на Міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая заўтра адкрываецца ў сталіцы, альбом знойдзе свайго чытача-слухача.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.












**ОАО «Витебсклес»**
**извещает акционеров о проведении очередного собрания акционеров 18 марта 2021 года в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 119А**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 год и определении основных направлений деятельности Общества в 2021 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2020 год.
4. Распределение прибыли Общества за 2020 год.
5. О направлениях использования прибыли Общества за 2020 год и в 1-м квартале 2021 года.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Витебск, ул. Ленинградская, 119А, приемная) в рабочие дни в период с 08 марта по 17 марта 2019 года с 9.00 до 16.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 марта 2021 года.

Регистрация участников собрания проводится с 9.30 до 10.45 по месту проведения собрания. Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность, а для представителей акционеров – и доверенности.

**Справки по тел. (8-0212) 26 29 66.** УНП 300029146

**Отчет по использованию Местным благотворительным фондом «Дать Надежду» своего имущества за 2020 г.**

Местный благотворительный фонд был зарегистрирован в мае 2017 г. Юридический адрес с местом нахождения руководящего органа: г. Бобруйск, здание казармы 9/3 в военном городке № 9 по ул. Кирова.

Учредителем фонда является гражданин Республики Беларусь Семенчуков Владимир Евгеньевич.

Стоимость имущества фонда за 2020 г. составляет 109 336 руб. 47 коп., в том числе Уставный фонд – 2 300 руб.

Сумма поступлений от проводимых мероприятий в соответствии с Уставом фонда за 2020 г. составляет 107 036 руб. 47 коп.

Сумма расходов на достижение общественно полезных целей в соответствии с Уставом фонда составляет 82 832 руб. 61 коп.

Сумма расходов на административно-хозяйственную деятельность составляет 5 905 руб. 47 коп.

Предпринимательскую деятельность фонд не осуществляет. Унитарных предприятий, хозяйственных обществ фондом не создавалось, и в таких юридических лицах фонд не участвует. УНП 790613339

**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ООО «Фермерский Агро Альянс»** (УНП 690671805), 223127, Минская обл., Логойский р-н, Логойский с/с, аг. Косино, ул. Промышленная, 1 в лице антикризисного управляющего ООО «Форхэнд», тел. +375 (29) 639-77-91.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **22 марта 2021 г. в 11.00 по адресу:** г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

Предмет торгов – клипсатор полуавтоматический C-PACK HLC 912. Начальная цена предмета торгов – 7 281,20 бел. руб. без НДС. Местонахождение – Минская обл., Смолевичский р-н, д. Домашаны, ул. Центральная, 23. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 18.02.2021 г. 09.00 по 19.03.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 1 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи – в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

УНН 190431606

**УП «Белконфискат»**
**объявляет о проведении электронных торгов 11.03.2021 г. по продаже имущества Бородинской Т.А.**

легковой седан «LANCIA LYBRA», 2000 г. в., начальной стоимостью 1120 рублей. На сайте belkonfiskat.by размещена информация о торгах. **Справки по тел. 8 (017) 3639489.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл, Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19, 222750 |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование (Назначение) | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | **Здание зарядной** (здание нежилое) общей площадью 886,8 кв. м, инв. номер 620/С-21266 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 25. **Обременение:** аренда. Подробная информация на сайте cpo.by | **899 476,80** белорусских рублей |
| **Сведения о земельном участке пл. 0,2854 га:** предоставлен на праве аренды по 07.10.2119 для строительства и обслуживания здания зарядной | | |
| 2 | **Экструзионная линия** модели «FCL 21/SH PRO-CAST» Dolce (Сер №UZ0014/04, изготовитель BIELLONI CASTELLO spa Италия, инв. номер нф00028) с холодильным оборудованием № 1 (Model: D 500/4/LE Serial № 280815201510511100, изготовитель: EUROCHILLER s.r.l. – ITALY, инв. номер нф 00027) | **1 116 000,00** белорусских рублей |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 60 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

